ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 55 (2108)
8 ліпеня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

«ВОЖЫК» СВЯТКУЕ ЮБІЛЕЙ

Папулярны сатырычны часопіс «Вожык» адзначыў сваё 25-годдзе.

6 ліпеня ў клубе журналістаў Мінска адбыўся вечар, прысвечаны гэтай даце. Яго адкрыў народны пісьменнік Беларусі Кандрат Крапіва. Аб шляху, пройдзеным «Вожыкам», расказаў галоўны рэдактар часопіса П. Н. Кавалёў.

З прывітаннямі да калектыву часопіса і яго чытачоў звярнуліся сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Янка Брыль, адказны сакратар праўлення Саюза журналістаў БССР Д. І. Чайка, галоўны рэдактар часопіса «Крокодил» М. Г. Сямёнаў, прадстаўнікі сатырычных часопісаў братніх рэспублік, рэдакцый газет і часопісаў, выдавецтваў.

У сувязі з юбілеем Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў групу супрацоўнікаў часопіса «Вожык» Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны рэдактар аддзела фельетонаў і пісьмаў Я. Герцовіч, няштатны мастак М. Гурло, рэдактар аддзела літаратуры С. Дзяргай, намеснік рэдактара аддзела фельетонаў і пісьмаў В. Зуб, галоўны рэдактар часопіса «Вожык» П. Кавалёў.

Граматай Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны літаратурны супрацоўнік Д. Бяспалы, рэтушор афсетнага цэха друкарні «Звязда» З. Курбаева, рэдактар мастацкага аддзела часопіса А. Чуркін, тэхнічны рэдактар Н. Шахрай.

За заслугі ў развіцці сатыры і выяўленчага мастацтва члену рэдкалегіі часопіса «Вожык» С. Рамانаву прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР.

У Мастацкім музеі БССР адкрылася выстаўка сатырычнага малюнка «Вожыку—25 гадоў». На ёй сабрана некалькі соцень малюнкаў розных гадоў.

ДЗЕВЯТАМУ З'ЕЗДУ АРХІТЭКТАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Дарагія таварышы!

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі і Савет Міністраў Беларускай ССР горача вітаюць удзельнікаў дзевятага з'езда архітэктараў Беларусі.

Партыя і ўвесь савецкі народ высока цэняць стваральную працу архітэктараў і будаўнікоў. Беларускімі архітэктарамі праведзена значная работа ў галіне горадабудаўніцтва, раённай планіроўкі, жыллёвага, грамадзянскага, прамысловага і сельскагаспадарчага будаўніцтва. За апошнія гады ў рэспубліцы пабудаваны буйныя заводы і фабрыкі, створаны прамысловыя вузлы, вырослі новыя гарады і жылыя раёны. Гэтым поспехам у значнай ступені садзейнічае прагрэсіўная, накіраванасць савецкай архітэктуры, заснаваная на індустрыялізацыі будаўніцтва. Праектуемыя будынкі і збудаванні ўсё паўней адпавядаюць патрабаванням сучаснай вытворчасці, запатрабаванням быту і культуры працоўных.

Дзевяты з'езд праходзіць у абстаноўцы высокага творчага ўздыму народа, выкліканага гістарычнымі рашэннямі XXIII з'езда КПСС. Савецкія людзі самаадданa працуюць над выкананнем новага пяцігадовага плана.

Бурны рост народнай гаспадаркі, імклівае развіццё навукі і тэхнікі, узрастаючыя запатрабаванні працоўных, шырокі размах будаўніцтва патрабуюць далейшай мабілізацыі энергіі і творчых сіл архітэктараў. Найпершы абавязак нашых архітэктараў — пастаянна ўдасканальваць якасць архітэктуры, памятаючы аб тым, што прыгажосць гарадоў і вёсак, будынкаў і збудаванняў, рацыянальная планіроўка, зручнасці, эканамічнасць, строгасць і мастацкая выразнасць архітэктурных форм, арганічна звязаных з канструкцыямі, матэрыяламі і індустрыяльнымі метадамі будаўніцтва, павінны стаць характэрнымі рысамі айчыннай архітэктуры.

Саюз архітэктараў Беларусі заклікан садзейнічаць фарміраванню творчай накіраванасці архітэктуры, павышэнню прафесіянальнага майстэрства архітэктараў, клапаціцца выхоўваць маладыя кадры архітэктараў, садзейнічаючы іх ідэйнаму і творчаму росту. Дзейнасць саюза павінна быць накіравана на хутчэйшае ўкараненне ў практыку ўсяго перадавога, прагрэсіўнага, на стварэнне архітэктуры, якая адпавядала б інтарэсам народа і адлюстроўвала б веліч яго барацьбы за камунізм.

Неабходна павысіць асабістую адказнасць і прынцыповасць кожнага архітэктара ў праектаванні і ажыццяўленні прынятых рашэнняў, своечасовым забеспячэнні будоўляў высакаякаснымі праектамі, эфектыўным выкарыстанні капітальных укладанняў, выяўленні і рэалізацыі наяўных рэзерваў. У сваёй рабоце яны павінны паўней выкарыстоўваць перавагі сацыялістычнай сістэмы, якая дазваляе вырашаць задачы горадабудаўніцтва з улікам перспектыў развіцця прадукцыйных сіл рэспублікі, найбольш мэтазгоднага размяшчэння прамысловых і жылых зон, ствараючы найлепшыя жыццёвыя ўмовы для насельніцтва.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі і Савет Міністраў БССР жадаюць дзевятаму з'езду архітэктараў Беларусі плённай работы і выказваюць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што архітэктары рэспублікі ўнясуць дастойны ўклад у ажыццяўленне праграмы будаўніцтва камунізма ў нашай краіне.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КП БЕЛАРУСІ

САВЕТ МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР.

НАРОДЫ — СЯБРЫ І ПАПЛЕЧНІКІ

ДНІ МАНГОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

У народзе гаворыць: адлегласць дружбе не перашкода. У гэтым кожны з нас мае магчымасць упэўніцца сёння, у Дні мангольскай культуры ў Беларусі. Дзе б ні паявіліся мангольскія госці — ці гэта шырокія праспекты беларускіх гарадоў, ці канцэртныя залы, ці заводскія цэхі — усюды іх сустракаюць добразычлівымі ўсмешкамі, гарачымі словамі прывітання.

Манголія і Беларусь. Край неатлядных стэпаў і край лясоў і сініх рэк. І побыт, і традыцыі ў нашых народаў розныя. Што ж тады радніць іх, што дае разбег шчырым пачуццям і агульнай прыязні? А тое, што ідзём мы ў адным страі, што народы нашы братнія па духу, па ідэі.

...Ужо з першых гадзін знаходжання мангольскіх сяброў на беларускай зямлі яны апынуліся ў самым цэнтры ўвагі грамадскасці нашай рэспублікі.

Вечарам 4 ліпеня ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі адбылася гутарка адказных работнікаў таварыства з мангольскімі гасцямі. У час гутаркі быў абмеркаваны план мерапрыемстваў, звязаных з правядзеннем Дзён мангольскай культуры ў Беларусі. Членам дэлегацыі былі паказаны дакументальныя кінафільмы, якія расказваюць аб нашай рэспубліцы.

ГУТАРКА Ў ЦК КПБ

Раніцай 5 ліпеня ў Цэнтральным Камітэце Кампартыі Беларусі адбылася гутарка кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КПБ П. М. Машэрава, Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва, сакратара ЦК КПБ С. А. Пілатовіча з членамі дэлегацыі Мангольскай Народнай Рэспублікі— Надзвычайным і Паўнамоцным паслом МНР у СССР Н. Луўсанчултэмам, міністрам культуры МНР С. Сосарбарамам, адказным сакратаром цэнтральнага савета Таварыства манго-ла-савецкай дружбы Р. Дэлтэр, пісьменнікам Д. Намдагам, заслужанымі артыстамі Мангольскай Народнай Рэспублікі Н. Нораўбанзад, Г. Хайдавам і Г. Жам'янам, артыстамі Дзяржаўнага ансамбля песні і танца МНР Д. Тунгалаг, Ц. Гомба, артысткай Музычна-драматычнага тэатра К. Хаду, спецыяльным карэспандэнтам газеты «У Нэн» у Савецкім Саюзе Б. Дашцэрэнам.

Гутарка, у якой прынялі ўдзел загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ Л. Г. Кляцкоў, С. В. Марцэлеў, міністр замежных спраў БССР А. Е. Гурыновіч, міністр культуры БССР М. А. Мінковіч, старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі В. С. Смірноў, прайшла ў дружалюбнай, сардэчнай абстаноўцы.

СУСТРЭЧА З ЖУРНАЛІСТАМІ

А крыху пазней нашы мангольскія сябры зноў сталі гасцямі асабняка Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Тут адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная адкрыццю Дзён мангольскай культуры ў Беларусі.

Прысутныя — карэспандэнты рэспубліканскіх газет і часопісаў, Беларускага радыё і тэлебачання. Тэлеграфнага агенцтва Беларускай ССР цёпла сустрэлі прадстаўнікоў братняга мангольскага народа.

Старшыня прэзідыума таварыства В. С. Смірноў, які адкрыў прэс-канферэнцыю, адзначыў, што Дні мангольскай культуры ў Беларусі з'яўляцца сапраўдным святам дружбы двух народаў, паслужаць далейшаму ўмацаванню іх братняга супрацоўніцтва.

У гарадах рэспублікі, паведаміў ён, будзе адкрыта звыш 100 выставак, якія раскажуць пра поспехі брацкага мангольскага народа ў развіцці эканомікі і культуры, у кніжных магазінах будуць наладжаны выстаўкі і продаж літаратуры аўтараў брацкай краіны.

Аб поспехах МНР у будаўніцтве новага жыцця журналістам расказаў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Мангольскай Народнай Рэспублікі ў Савецкім Саюзе Н. Луўсанчултэм.

Прадстаўнікі прэсы цікавіліся жыццём мангольскага народа, развіццём брацкіх сувязей Беларусі і Манголіі. На іх шматлікія пытанні далі вычарпальныя адказы міністр культуры МНР С. Сосарбарам, карэспандэнт газеты «У Нэн» Б. Дашцэрэн, адзін з вядомых мангольскіх пісьменнікаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі МНР Д. Намдаг і іншыя.

Пасля прэс-канферэнцыі мангольскія госці накіраваліся на плошчу Перамогі, дзе ўсклалі вянок да помніка-абеліска воінам Савецкай Арміі і партызанам Беларусі, якія загінулі ў баях за вызваленне нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Затым члены дэлегацыі азнаёміліся з выдатнымі мясцінамі Мінска.

НЕЗАБЫЎНЫ ВЕЧАР

Вечарам таго ж дня сотні мінчан — рабочыя, служачыя, пісьменнікі, артысты, дзеячы навукі і культуры, студэнты ВНУ, партыйныя, савецкія і прафсаюзныя работнікі сабраліся ў канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі на ўрачысты вечар, прысвечаны 45-й гадавіне народнай рэвалюцыі ў Манголіі і адкрыццю Дзён мангольскай культуры ў БССР.

У прэзідыуме — П. М. Машэраў, Ц. Я. Кісялёў, І. М. Макараў, С. А. Пілатовіч, Д. Ф. Філімонаў, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, С. В. Марцэлеў, міністр замежных спраў БССР А. Е. Гурыновіч, міністр культуры БССР М. А. Мінковіч, міністр асветы БССР Р. Я. Кісялёў, першы сакратар Мінскага гаркома КПБ Л. П. Пятліцкі, старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі В. С. Смірноў, сакратар ЦК ЛКСМБ Р. С. Піёнава, паэт М. І. Калачынскі, народны артыст БССР Л. Ф. Бражнік, рабочая абуткова аб'яднання «Прамень» Г. А. Бараноўская і інш.

Цёпла сустракаюць прысутныя з'яўленне ў прэзідыуме дарагіх мангольскіх гасцей.

Кароткім уступным словам урачысты вечар адкрыў сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч. Ад імя ЦК КПБ, Савета Міністраў, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, ад імя ўсіх працоўных рэспублікі ён сардэчна вітаў дарагіх гасцей, пажадаў брацкаму мангольскаму народу далейшых поспехаў у будаўніцтве сацыялізма.

З дакладам аб 45-й гадавіне народнай рэвалюцыі ў Манголіі выступіў міністр асветы БССР Р. Я. Кісялёў. Ён падкрэсліў, што за кароткі гістарычны перыяд працоўныя Манголіі пад кіраўніцтвам свайго выпрабаванага авангарда — Народна-рэвалюцыйнай партыі зрабілі скачок ад сярэдневякоўя і адсталасці да сацыялізма і прагрэсу.

Дакладчык гаворыць, што сённяшняя Манголія — гэта краіна, дзе набылі развіццё энергетычная, нафтавая, горнарудная, каменнавугальная, будаўнічая, тэкстыльная, харчовая і іншыя галіны прамысловасці.

Адбыліся велізарныя змены ва ўзроўні дабрабыту народа, яго культуры. У Манголіі ў 1955 годзе была ўведзена ўсеагульная абавязковая пачатковая адукацыя дзяцей школьнага ўзросту, а ў 1958 годзе — абавязковая сямігадовая адукацыя ў гарадах і аймачных цэнтрах. Шырокае развіццё набылі сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя, ахова здароўя.

Паспяхова развіваюцца навука, мастацтва, нацыянальная літаратура, кінематаграфія. Вырасла цэлая плеяда таленавітых пісьменнікаў, артыстаў.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Мангольскія госці знаёмяцца са сталіцай нашай рэспублікі.

Фота Ул. КРУКА.

У сяброўскай гаворцы: лаўрэат Дзяржаўнай прэміі МНР пісьменнік Д. Намдаг і беларускі паэт М. Калачынскі.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ

АВЕЧЫ КАМЕНЬ

Мангольскаму сабрату Д. Намдагу

У стэпе шэрым, дзе пайшлі дажджы,
Гурты авечак шэрых, як аблокі.
Празяблы вецер. Чабану ў плашчы
Ніяк не ўгрэцца: ўсе рубцы прамоклі.

Настыла ў хлопца на вятры душа,
А рукі дужыя — не рукі — граблі.
І воўнаносам сніцца іх хашан —
Павець з бярвенняў, цёсаных нязграбна.

Хутчэй бы ў юрту!
Ды не кінеш гурт
Пад мокрым, небам на зямлі бязмежнай.
Яшчэ ж, бывае, з карагана тут
Клыкі выносіць на бяду драпежнік.

Юнак успомніў, як у даўніну
Служыў аратам крэмень белы ў стэпе.
Авечым каменем, казалі чабану,
Завецца ён — прыдумаць нельга лепей.

І азірнуўся навакол хлапец,
Крыху прысеў, узяў зямлю рукамі.
Шуміць палын, блішчыць трава вастрэц
І ўсё ж не зяе ў іх авечы камень.

Ды пошук быў не марны. Ад таго,
Што жыў чабан пра цеплыню надзеяй,
І рукі пацяплелі ў яго
І шчокі на вятры аж заірдзелі.

Хоць шэрыя дажджы ішлі, ішлі
І камень не знаходзіўся авечы,
Свяціўся стэп: як Данка, запаліў
Чабан у ім душы сваёй агеньчык.

Група дэлегатаў і гасцей IX з'езда архітэктараў БССР — архітэктар Віцебскай майстэрні «Белдзяржпраекта» А. Данілава, сакратар праўлення Саюза архітэктараў Украіны Р. Галаўко, член праўлення Саюза архітэктараў СССР М. Кім, старшыня праўлення Саюза архітэктараў Літвы І. Вашкевічус, дырэктар «Белгіпрагандлю» В. Аладаў.

ФОРУМ ДОЙЛІДАЎ

Два дні, 5 і 6 ліпеня, у Мінску ў памяшканні акруговага Дома афіцэраў праходзіў чарговы, IX з'езд архітэктараў Беларусі.

Тут сабраліся творчыя работнікі «Белдзяржпраекта», «Мінскпраекта», «Белпрампраекта», «Белгіпрагандлю», выкладчыкі навучальных устаноў, якія рыхтуюць новыя архітэктурныя кадры, супрацоўнікі навукова-даследчых інстытутаў, архітэктары абласных гарадоў і буйных раённых цэнтраў, госці з братніх саюзных рэспублік, кіруючыя работнікі партыйных і савецкіх устаноў.

Сакратар ЦК КПБ Д. Філімонаў зачытаў прывітанне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і Савета Міністраў БССР IX з'езду беларускіх архітэктараў.

Са справаздачным дакладам праўлення Саюза архітэктараў БССР выступіў старшыня праўлення Э. Дзямідаў.

У спрэчках па дакладу выступілі галоўны архітэктар «Белдзяржпраекта» В. Чарнышоў, член праўлення Саюза архітэктараў Літвы І. Вашкевічус, дырэктар «Мінскпраекта» І. Ляўко, кіраўнік майстэрні «Мінскпраекта» Ю. Грыгор'еў, старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР Ул. Стэльмашонак, член прэзідыума праўлення Ленінградскага аддзялення Саюза архітэктараў СССР В. Папоў, галоўны архітэктар Мінска А. Наканечны, галоўны архітэктар «Белгіпрагандлю» Г. Сысоеў, начальнік аддзялення генпланаў «Белпрампраекта» М. Амельянюк, член праўлення Саюза архітэктараў Малдавіі А. Ціміразеў, дырэктар гомельскай майстэрні «Белдзяржпраекта» А. Карамышаў, член праўлення Саюза архітэктараў Азербайджана С. Аміраў, галоўны архітэктар праектаў «Белгіпрасельпраекта» В. Емяльянаў, сакратар праўлення Саюза архітэктараў СССР М. Кім, начальнік Самаркандскага абласнога аддзела па будаўніцтву і архітэктуры Ш. Хайдарава, начальнік Мінскага ўпраўлення будаўніцтва і архітэктуры Г. Парсаданаў, галоўны архітэктар Барысава І. Збароўскі, старшыня праўлення Саюза архітэктараў Украіны Р. Галаўко, дацэнт Беларускага політэхнічнага інстытута В. Анікін, член праўлення Саюза архітэктараў Арменіі Г. Качар, дырэктар Інстытута будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР С. Атаеў, член праўлення Саюза архітэктараў Грузіі Н. Шашытайшвілі, член праўлення Саюза архітэктараў Кіргізіі Р. Куцэмелаў, старшыня Дзяржбуда БССР Ул. Кароль, выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута В. Гусеў.

З'езд абраў новае праўленне Саюза архітэктараў на чале са старшынёй В. Аладавым і рэвізійную камісію.

Прынята рэзалюцыя, якая накіроўвае работу беларускіх архітэктараў на паспяховае вырашэнне надзённых задач.

Сёння мы знаёмім чытачоў са зместам справаздачнага даклада праўлення Саюза архітэктараў Беларусі. Справаздача аб спрэчках будзе змешчана ў наступным нумары газеты.

IX З'ЕЗД АРХІТЭКТАРАЎ БССР

ПРАЕКТАВАЦЬ ПА-СУЧАСНАМУ, БУДАВАЦЬ ВЫСАКАЯКАСНА

СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА

Час, які мінуў пасля VIII з'езда архітэктараў Беларусі, быў напоўнены важнейшымі гістарычнымі падзеямі ў жыцці краіны, галоўная з якіх — XXIII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Партыя паставіла перад народам новыя задачы па далейшаму павышэнню росту грамадскай вытворчасці, хуткаму развіццю прамысловасці і сельскай гаспадаркі. У Дырэктывах з'езда па новаму пяцігадоваму плану прадугледжаны вялікі размах будаўніцтва, павышэнне якасці будаўнічых і мантажных работ, зніжэнне іх кошту, паляпшэнне праектнай справы.

Савецкі архітэктар — не толькі мастак і будаўнік, ён актыўны памочнік партыі ў здзяйсненні яе грандыёзных задач, дзяржаўны дзеяч, у руках якога велізарныя народныя сродкі. Нашы архітэктары, нягледзячы на шэраг цяжкасцей, робяць многае, каб яшчэ больш палепшыць умовы працы, быту і адпачынку савецкіх людзей, больш эфектыўна выкарыстоўваць дзяржаўныя капіталаўкладанні ў жыллёвае, грамадзянскае і прамысловае будаўніцтва ў нашай рэспубліцы. Адна з важнейшых задач сёння — павышэнне якасці архітэктуры. Выкананне гэтай задачы трэба разумець як сапраўды сацыяльны, эканамічны, тэхнічны і мастацкі прагрэс дойлідства.

Спыняючыся на пытаннях раённай планіроўкі, Э. Дзямідаў зазначае, што яна ў нас праводзіцца даўно і ўжо выкананы значны аб'ём праектных работ. Гэта перш за ўсё Мінскі, Салігорскі, Мазырскі, Жлобінскі, Полацкі і іншыя прамысловыя раёны. Выяўлена больш 30 малых гарадоў са спрыяльнымі ўмовамі для прамысловага развіцця і грамадзянскага будаўніцтва (Асіповічы, Жлобін, Мазыр, Ліда, Кобрын і інш.).

Аднак у гэтай справе ёсць яшчэ істотныя недахопы. Напрыклад, аб'екты, звязаныя з абслугоўваннем сельскагаспадарчай вытворчасці і перапрацоўкай сельскагаспадарчых прадуктаў, як правіла, размяшчаюцца ў вялікіх гарадах, такіх, як Брэст, Бабруйск, Магілёў, Гродна, Гомель. У выніку павялічваецца колькасць іх насельніцтва і не стымулюецца развіццё малых гарадоў. Не ўсё добра і ў Мінску. Многія міністэрствы і ведамствы, выкарыстоўваючы любыя зачэпкі, усяляк развіваюць тут прамысловыя прадпрыемствы, а між тым агульнапрызнана, што перанасычэнне гарадоў прамысловасцю вельмі непажадана.

Работы па раённай планіроўцы ў нас часам вядуцца разрозненымі арганізацыямі, без строгай каардынацыі і ўзаемасувязі. Трэба аб'яднаць на навуковай аснове намаганні «Белдзяржпраекта», «Белгіпрасельбуда», Інстытута будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР, якія распрацоўваюць схемы і праекты раённай планіроўкі.

Дакладчык характарызуе архітэктуру будаўніцтва, што вядзецца ў новых беларускіх гарадах — Салігорску, Светлагорску, Наваполацку, адзначае, што там не вырашаны яшчэ пытанні культурна-бытавога абслугоўвання. Тэрыта гарады пакуль яшчэ недастаткова добраўпарадкаваны.

— Вялікая падзея ў беларускай архітэктуры,— гаворыць далей Э. Дзямідаў, — распрацоўка генеральнага плана Мінска. Ён выкананы аўтарскім калектывам «Мінскпраекта» і з'яўляецца новым этапам у творчасці нашых горадабудаўнікоў. У праекце акумуліраваны прагрэсіўныя тэндэнцыі савецкага горадабудаўніцтва. Паслядоўна праведзены прынцып падзелу горада на планіраваныя раёны. Адначасова комплексна распрацаваны праект прыгараднай зоны.

Праект планіроўкі Мінска атрымаў высокую ацэнку Дзяржбуда і Дзяржплана СССР і сёння стаў прыкладам не толькі для горадабудаўніцтва Беларусі. Да нас прыязджаюць знаёміцца з ім і архітэктары сацыялістычных краін. Аўтары праекта Н. Трахтэнберг, І. Люблінскі, М. Кудзінаў, Л. Гафо, А. Наканечны, Я. Заслаўскі, Л. Кантаровіч, Д. Краўцоў, Г. Горына, Л. Есьман і іншыя з поўным правам могуць быць названы сцяганосцамі сучаснага горадабудаўніцтва. Цяпер праект Мінска ажыццяўляецца. На яго аснове праектуюцца жылыя раёны Чыжоўка, па Ракаўскай шашы, на плошчы Веры Харужай, на вуліцы Якуба Коласа і інш. Архітэктары творча вырашаюць нямала складаных задач, абумоўленых канкрэтнай планіровачнай сітуацыяй, рэльефам мясцовасці.

На жаль, у рэспубліцы да гэтага часу ўсё яшчэ не вырашаны пытанні комплекснага фінансавання забудовы мікраёнаў. У сувязі з гэтым гандлёвыя цэнтры, як правіла, будуць завяршаць, а не апераджаць жылую забудову. Таму сёння нават у Мінску ў вялікіх мікраёнах па вуліцы Харкаўскай і па Ракаўскай шашы ёсць толькі па адным-два магазіны. Падобнае становішча і ў іншых гарадах — у Гомелі ў мікраёнах па Рэчыцкай шашы, у Гродна па вуліцах Савецкіх пагранічнікаў і Горкага і г. д. Гэта дыскрэдытуе прагрэсіўныя прынцыпы сучаснага горадабудаўніцтва.

Асобныя міністэрствы не спяшаюцца будаваць у жылых раёнах будынкі для ўстаноў гандлю, аховы здароўя, кінатэатры, бібліятэкі. Таму неабходна зрабіць так, каб у горадзе быў адзін гаспадар, які б комплексна вёў забудову.

Нельга не сказаць пра непажаданы працэс, які вядзе да таго, што паступова раствараецца індывідуальнае аблічча гарадоў. Многія новыя жылыя раёны Масквы і Ташкента, Віцебска і Ленінграда мала чым адрозніваюцца адзін ад аднаго. І гэта тлумачыцца тым, што сучасная масавая жыллёвае будаўніцтва вядзецца пераважна аднатыпнымі жылымі дамамі заводскага вырабу.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Спектаклі нашых гасцей

ГЛЫБІНІ І ВОДМЕЛІ

«Старонка дзённіка» — так называецца п'еса А. Карнейчука, якой адкрыў першы свой гастрольны прыезд у Мінск Кіеўскі дзяржаўны акадэмічны ўкраінскі драматычны тэатр імя Франка.

Калі гаварыць шчыра, гэта не лепшая п'еса А. Карнейчука, але адна з апошніх, да таго ж — на сучасную тэму. Мабыць, кіруючыся гэтымі меркаваннямі і паставіў яе тэатр у сваім рэпертуары на такое пачэснае месца.

Паглядзім жа, наколькі яна сучасная па ўнутранаму напаўненню, па пульсу жыцця, што струменіць у ёй.

Многае можа змясціць нават адна старонка з дзённіка чалавека, чые думы і мары, надзеі і спадзяванні выспявалі і нараджаліся ва унісон з думамі і спадзяваннямі народнымі. І таму чакаеш ад п'есы дакляраванай у загалоўку шчырай і значнай размовы аб запаветным.

Але сталася так, што на гэтую старонку трапілі і не вартыя глыбокага роздуму, выпадковыя жанравыя замалёўкі, недарэчныя жарты, ледзь не анекдоты... А з таго, што закранае ўвагу, многае чута ўжо недзе раней... Затое часам вельмі вартае ўвагі, тое, што магло б стаць эпіцэнтрам п'есы, застаецца на абочыне, па-за драматургічным дзеяннем. Напрыклад, на другі план адышоў лёс Багутоўскіх: бацькі — мастака, былога «ўладара дум», лаўрэата, які «некалі грымеў», і сына, які ў час Айчыннай вайны трапіў у палон і на гэтай падставе пазбавіўся бацькі... А былі б яны на першым плане, тады б, можа, даволі абстрактныя размовы аб узаемасувязях мастацтва і жыцця ператварыліся ў адну з галоўных і канкрэтна адчувальных праблем п'есы, а не «прагаворваліся» па ходу дзеяння. Вось як, дарэчы, гаворыць Карняйчук (даволі лаканічна, але досыць выразна, каб зразумець дваістую пазіцыю аўтара ў адносінах да героя) вуснамі драматурга Іскры пра Багутоўскага-мастака: «Талент у яго вялікі, толькі не туды ён яго накіроўваў». І тут жа нібы шукае апраўдальныя матывіроўкі: «Хоць ці ён адзін так рабіў?». А рабіў ён, аказваецца, пампезныя партрэты і «быў з тых, хто асабліва падхалімнічаў перад «власть имущими». І вось тут А. Карняйчук прапануе адзінае лякарства ад гэтай хваробы, якую «пастановамі не адменіш». Наколькі яно дзейснае, мяркуйце самі: «Каб падобная хвароба знікла, усім трэба паменей ківаць на іншых і часцей і глыбей углядацца ў сябе. Часцей рабіць у сваёй душы прапалку».

Слабасці п'есы ў нейкай меры выратоўвае выдатнае майстэрства тэатра, яго цудадзейная ўласцівасць рабіць нават неверагоднае верагодным, тонкае майстэрства псіхалагічнага аналізу, якім выдатна валодаюць акцёры-франкоўцы. Тэатр здолеў вылучыць з драматургічнага матэрыялу галоўную для сябе і для аўтара тэму і вырашыў яе дасканала, заклікаўшы на дапамогу такую вялікую сілу, як акцёрская інтуіцыя. І тады на першы план выйшаў жывы чалавек — Іларыён Граза. Акцёр магутнага таленту Ул. Дальскі ў ролі старога боцмана сапраўды ўзрушае. Ён так глыбока раскрывае трагедыю свайго героя, яго дваццацігадовую пакуту і негаючы боль ад здрады найбліжэйшага чалавека — жонкі Марыны, — якую ён пакараў смерцю і чыё дзіця ад італьянскага афіцэра «збярог ад крыўды» і выгадаваў. Ён і любіць, і ненавідзіць, і шкадуе, і помсціцца дачцы невядома за што, шалёна лютуючы п'яны. І няма яму спакою, бо таямніцу яе нараджэння, бо сваё злачынства хавае ён ад усіх не дзеля сябе — дзеля яе, Юлькі, — што стала яму дачкой...

Доўга будуць жыць у памяці гледача яго панурая, прыгнутая постаць, усплываць час ад часу то інтанацыя, то жэст, то проста маўклівы, але такі красамоўны позірк. Узрушае не толькі вывераная майстэрства акцёра, тонка прадуманы кожны крок, кожная рысачка аблічча персанажа, вонкавага і ўнутранага, але і тая грамадзянская сіла, той пафас сцвярджэння найвышэйшай гуманнасці, якія ўкладае выдатны артыст у поўны драматызму вобраз старога боцмана.

І яшчэ адна радасць першай сустрэчы з тэатрам...

...Мы адразу пазналі Юльку ў гэтай дзікаватай, стромкай постаці з вуглаватымі рухамі, калючымі локцямі і вострымі ключыцамі, якія не магла схаваць матроская цяльняшка. І нельга было не пазнаць яе ў гэтай дзяўчынцы з тонкімі і выразнымі рысамі нетутэйшага твару — такі не забудзеш ніколі, — на якім то ззялі ад шчасця, то гарэлі гнеўным полымем, то мігцелі, як агонь свечкі пад ветрам, у недаўменні ці сполаху — не за сябе — за бацьку! — шырока расчыненыя ў свет велізарныя вочы, — то сталёва пранізлівыя, то сінія-сінія, як валошкі ў жыце. Яны, гэтыя вочы, несціхана гаварылі, апавядаючы часам такое, чаго, мабыць, і не было ў п'есе Карнейчука... На ўсё жыццё, здаецца, запомніўся яе апошні вокліч: «Тата!» Тут не было і ценю меладрамы, да якой яшчэ часам «па традыцыі» вельмі хіляцца нашы ўкраінскія сябры. Была трагедыя... (Гэтыя радкі пішуцца ўжо пасля прагляду наступнага спектакля ўкраінскіх гасцей — «Антыгоны» Сафокла, дзе выканаўца ролі Юлькі С. Каркошка іграе галоўную ролю. І радасна адзначыць, што гэтая зусім маладая актрыса, надзеленая багатай і яркай, вельмі своеасаблівай і моцнай індывідуальнасцю, **нідзе, ні ў чым** не паўтараецца, калі параўноваеш яе выкананне ў абодвух спектаклях).

Выдатна валодае майстэрствам перадачы думак і пачуццяў праз рампу заслужаны артыст УССР М. Задняпроўскі (Край), акцёр вялікага заразлівага тэмпераменту, багата надзелены пачуццём іроніі. Некалькі менш значнай, чым жадалася, фігурай атрымаўся Іскра, якога іграе М. Дасенка. Ды па праўдзе сказаць, удыхнуць жыццё ў такую рэзанёрскую ролю — задача надзвычай цяжкая, і аднаго акцёра вінаваць у гэтым было б несправядліва.

Некаторыя ж акцёры, калі нестае ў ролі значнага матэрыялу для выяўлення характару, пачынаюць шукаць характарнасць. Вельмі цяжка рэжысёру, нават такому вопытнаму «стырнавому», як В. Лізагуб, які выбудаваў гэты спектакль з найвялікшай стараннасцю і дакладнасцю, утрымаць свой «карабель» у раўнавазе, калі на яго шляху сустракаюцца «паветраныя ямы» недасканалай драматургіі, бо тады сёй-той з экіпажу хапаецца за выратавальныя штампы, просіць «ратунку» ў гледача. Вось гэтыя сігналы «SOS», якія час ад часу падаюць са сцэны ў залу, і зніжаюць добрае ўражанне ад культуры спектакля, хоць і сустракаюцца, калі шчыра казаць, пэўнай часткай гледачоў спачувальна. Я маю на ўвазе ўсе гэтыя пацешныя сутычкі-пікіроўкі паміж Краем і Іскрай, Магдалінай (Н. Літвіненка) і Веранікай (Ю. Ткачэнка) і іншымі парамі. Яны маглі б упрыгожыць любы эстрадны канцэрт ці, урэшце, паказ тэатра мініяцюр, калі б не было на Украіне яшчэ лепшай, проста такі бліскучай пары — Штэпсель і Тарапунька, чые бясконцыя «канфлікты» мы гатовы слухаць і разбіраць штодня. Наяўнасць жа падобных «рэпрыз» у драматычным спектаклі тлумачыцца, як мне здаецца, не пільнай патрэбай «утрымаць» гледача — для гэтага ў тэатры імя Франка багата іншых сродкаў, якія, дарэчы, франкоўцы з гонарам прадэманстравалі ўжо на першых спектаклях, а проста безаглядной павагай да свайго лепшага драматурга, кожнае слова якога для тэатра — закон. Рабіць купюры — рука не паднімаецца. Застаецца адно: любымі сродкамі апраўдаць нават самыя слабыя месцы ў п'есе. Вось тады ўрываюцца ў спектакль, які можна было б назваць сімфоніяй гневу і літасці,—чужыя яго настрою ноты — якія пачуеш хіба толькі на эстрадзе. Разрадка ў драме — рэч неабходная, але і да яе падводзіць гледача трэба з густам, перш за ўсё дбаючы аб пачуцці меры.

Хочацца пажадаць поспеху цудоўным акцёрам тэатра — а гэты спектакль якраз і з'яўляецца акцёрскім — і падзякаваць ім за тое, што яны здолелі ўзняць не дужа дасканалы драматургічны матэрыял на пэўную мастацкую вышыню, прымусіўшы нас, гледачоў, не толькі паверыць у існаванне персанажаў, выведзеных рэжысёрам са старонкі пісьменніцкага дзённіка на сцэну, але і зрабіць іх клопат, іх турботы, іх барацьбу цікавай старонкай жыцця.

Тамара БУШКО.

ДНІ МАНГОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

КАНЦЭРТ СЯБРОЎ

Гэтыя здымкі наш фотакарэспандэнт Ул. Крук зрабіў 5 ліпеня ў зале Белдзяржфілармоніі на канцэрце, прысвечаным 45-й гадавіне народнай рэвалюцыі ў Манголіі і адкрыццю Дзён мангольскай культуры ў Беларусі.

Кожнае выступленне нашых мангольскіх сяброў праходзіла з вялікім поспехам, выклікала буру апладысментаў — даніну майстэрству артыстаў, самабытнаму мастацтву далёкага і разам з тым такога блізкага нам мангольскага народа.

Ц. ГОМБА, саліст Дзяржаўнага ансамбля народнай песні і танца МНР.

К. ХАДУ, салістка Баян-Ульгійскага музычна-драматычнага тэатра.

Д. ТУНГАЛАГ, артыстка дзяржаўнага ансамбля народнай песні і танца МНР.

Г. ХАЙДАЎ, саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета МНР.

Г. ЖАМ'ЯН, заслужаны артыст МНР.

Н. НОРАЎБАНЗАД, салістка Дзяржаўнага ансамбля народнай песні і танца МНР.

ПАДПІСКА — НЕ АДПІСКА

Кожнае перыядычнае выданне мае сваіх пэўных адрасатаў, з улікам патрабаванняў якіх і працуе той ці іншы рэдакцыйны калектыў. Само сабой зразумела, што адрасат, напрыклад, нашых рэспубліканскіх літаратурна-мастацкіх часопісаў — сотні тысяч чытачоў. Ну, а іх тыражы? Як ні дзіўна, тыражы нашых часопісаў пакуль што зусім невялікія — некалькі тысяч экземпляраў. У чым прычына? Што перашкаджае беларускім літаратурна-мастацкім часопісам стаць сапраўды масавымі выданнямі?

Перш-наперш, слабая прапаганда іх. Рэдакцыі часопісаў аддаюць мала ўвагі распаўсюджванню сваіх выданняў сярод насельніцтва. Яны рэдка наладжваюць канферэнцыі і сустрэчы з чытачамі, не практыкуюць выязных пасяджэнняў рэдкалегій і г. д. Недастаткова выкарыстоўваюцца для прапаганды нашых выданняў рэспубліканскі і мясцовы друк, радыё і тэлебачанне.

І ўсё ж да таго часу, пакуль у чытачоў не будзе магчымасці на свае вочы бачыць той ці іншы часопіс, пагартаць, пачытаць яго, нашы намаганні па іх прапагандзе наўрад ці будуць мець значны поспех у павелічэнні падпіскі, а, значыць, і тыражоў. Таму і хочацца больш падрабязна пагаварыць пра падпіску на газеты і часопісы, у прыватнасці пра падпіску за дзяржаўныя сродкі для месц калектыўнага чытання: клубаў, бібліятэк, дамоў культуры, школ і г. д.

У перыяд мінулагодняй падпісной кампаніі Міністэрства культуры, Міністэрства асветы, Міністэрства аховы здароўя рэспублікі і Белсаўпроф распрацавалі для сваіх бібліятэк рэкамендацыйныя падпісныя спісы. На жаль, спісы гэтыя былі не зусім прадуманы, у іх было ўключана ледзь не палова назваў усіх перыядычных выданняў краіны. Таму бібліятэкі вымушаны былі, у адпаведнасці са сваімі сродкамі, складаць уласныя спісы, часта не звяртаючы ўвагі на міністэрскія. І гэтыя апошнія спісы цалкам залежалі ад густаў, схільнасцей і асабістых патрэб тых ці іншых людзей.

Хіба можна ўявіць сабе масавую бібліятэку без часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Беларусь»! На іх старонках — сённяшні дзень рэспублікі, яны расказваюць пра гісторыю, культуру нашага народа, пра прыроду нашага краю. У гэтых часопісах друкуюцца новыя раманы, аповесці, вершы і паэмы нашых паэтаў і празаікаў.

Між тым, менавіта гэтыя часопісы якраз і не былі ўключаны ў заяўкі многіх масавых бібліятэк. Чаму? Пытанне гэтае я задаваў многім адказным работнікам. Яны прыводзілі многа доказаў, але ніводнага пераканаўчага.

У Крупскім раёне спісы перыядычных выданняў, якія павінны былі выпісаць на гэты год сельскія клубы і бібліятэкі, складаліся ў аддзеле культуры. Апрача газет, для сельскіх клубаў раёна было выпісана па 11, а для сельскіх бібліятэк — па 15 назваў часопісаў. Як ні дзіўна, сярод іх няма ніводнага рэспубліканскага літаратурна-мастацкага часопіса.

На маё здзіўленне-запытанне загадчык раённага аддзела культуры тав. Пыл адказаў, што спісы дэталёва прадуманы і ўсё самае неабходнае ў іх уключана. Я нагадваю загадчыку аддзела культуры, што ў нас з 1953 года выходзіць такі, к прыкладу, папулярны часопіс, як «Маладосць», выходзіць з дадаткам у дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці «А гармонік грае, грае...» Як жа можна, кажу, пазбаўляць гэтага часопіса нашы сельскія клубы і бібліятэкі?

— Нічога, — спакойна адказаў мне тав. Пыл, — для гурткоў мастацкай самадзейнасці мы выпісалі «Молодежную эстраду».

— Але ж мне здаецца, — зноў кажу я, — што сельскім чытачам хацелася б сачыць за сваёй роднай літаратурай, чытаць новыя творы беларускіх пісьменнікаў.

— Правільна, — не губляецца загадчык раённага аддзела культуры.— Мы і гэта ўлічылі. Для ўсіх бібліятэк мы выпісалі «Роман-газету», у якой, як вядома, друкуюцца творы і беларускіх пісьменнікаў...

Пераканаць, што ён памыляецца, было цяжка...

Не намнога лепшая была заяўка Гомельскага раённага аддзела культуры для 21 сельскай бібліятэкі раёна. У заяўцы — 33 выданні. Ні «Маладосць», ні «Полымя» туды не трапілі. Беларускую літаратуру ў ёй прадстаўляе часопіс «Неман».

Яшчэ больш суб'ектывізму ў раёнах, дзе падпіска ўвогуле не кантралявалася з боку раённага аддзела культуры. Там ужо сапраўды — што ні пан, то і каптан. У Пухавіцкім агенцтве «Саюздрук» мне трапіла на вочы заяўка Блужскай сельскай бібліятэкі. У ёй значылася — ні многа, ні мала — 46 выданняў. Нягледзячы на гэта, у ёй не знайшлося месца для «Звязды», «Чырвонай змены», «Літаратуры і мастацтва», «Полымя», «Маладосці» і «Беларусі». Затое ў заяўку былі ўключаны выданні, якіх нават не значылася ў вялізным спіску Міністэрства культуры БССР, — «Литература в школе», брашуры таварыства «Веды» з серыі «Педагогический факультет» и г. д. Я пацікавіўся, хто ж чытае гэтыя выданні. Аказалася, толькі той, хто складаў заяўку, — сама бібліятэкарка: яна вучыцца завочна ў педагагічным інстытуце.

Не выпісваюць рэспубліканскіх выданняў і многія прафсаюзныя бібліятэкі. З такімі фактамі мне давадзілася сутыкацца, у прыватнасці, у Магілёве, Гомелі і іншых месцах.

Той-сёй для апраўдання свайго вельмі адвольнага падыходу да вызначэння чытацкага попыту выцягвае на свет старую байку аб тым, што, маўляў, беларускія часопісы не карыстаюцца папулярнасцю. Адкуль жа возьмецца гэтая папулярнасць, калі часопіса няма нават у бібліятэцы!

Некалькі слоў аб падпісцы на газеты і часопісы ў школьных бібліятэках рэспублікі. Тут таксама шмат, мякка кажучы, адвольнага. Мне давадзілася сустракаць школы, дзе не выпісваліся нават такія выданні, як «Правда» альбо «Звязда» (пра нашы часопісы я ўжо не гавару). На мае заўвагі кіраўнікі школ звычайна адказвалі так: усё не выпішаш, не хапае сродкаў. На якія ж выданні трацяцца ў такім выпадку дзяржаўныя сродкі? Аказваецца, многія школы выпісваюць для «калектыўнага чытання» такія часопісы, як «Литература в школе», «Физика в школе», «Химия в школе», «Преподавание истории в школе», «Математика в школе» і іншыя, разлічаныя на аднаго-двух настаўнікаў. Відаць, намнога разумней было б, калі б вузка спецыяльныя часопісы выпісвалі самі выкладчыкі-прадметнікі, а сродкі адпускаліся на выданні, якія могуць чытаць усе: і настаўнікі, і вучні.

У друку шмат гаворыцца пра паляпшэнне методыкі выкладання ў школе роднай літаратуры, пра эстэтычнае выхаванне школьнікаў, пра развіццё ў іх самастойнага творчага мыслення. У гэтай справе добрую паслугу школе маглі б аказаць нашы літаратурна-мастацкія часопісы.

Спашлюся тут на адзін прыклад. Нядаўна мне давялося быць на дзяржаўных экзаменах у Мядзельскай сярэдняй школе. Проста прыемна было слухаць глыбокія, грунтоўныя адказы выпускнікоў школы па беларускай літаратуры. Школьнікі ведалі не толькі праграмныя творы. Яны выказвалі свае, даволі сталыя меркаванні пра новыя творы І. Мележа, І. Шамякіна, П. Панчанкі, В. Быкава. Чаму? Выкладчыкі роднай літаратуры К. Каратай і І. Малько ўважліва сочаць за сённяшнім днём нашай літаратуры, любяць яе і гэтую любоў перадаюць вучням. Часопісы «Полымя», «Маладосць», «Бярозка», «Вясёлка», якія выпісвае школа, тут не залежваюцца.

Менавіта таму трэба вельмі ўважліва паставіцца да забеспячэння школьных бібліятэк перыядычнымі выданнямі, асабліва рэспубліканскімі літаратурна-мастацкімі часопісамі. Гэтае пытанне важнае яшчэ і таму, што школы нашы вельмі кепска забяспечаны літаратурай. Напрыклад, дырэктар Жыцькаўскай сярэдняй школы Барысаўскага раёна тав. Ляпіч скардзіўся мне, што школа не можа нідзе дастаць такіх кніг, як «Трывожнае шчасце» І. Шамякіна, «Тысяча небасхілаў» П. Панчанкі, «Сасна пры дарозе» І. Навуменкі, «Працяг размовы» Я. Брыля, што ў кнігарнях няма на беларускай мове «А дні ідуць» П. Броўкі, «Мой хлеб надзённы» М. Танка і г. д. Кніга М. Танка «Мой хлеб надзённы» не трапіла нават на радзіму паэта. Як гаварыла мне настаўніца Нарацкай сярэдняй школы Р. Цэкала, гэты зборнік вершаў яны вымушаны былі купіць на рускай мове. Яна ж скардзілася таксама, што школа не змагла набыць ніводнага экземпляра «Альпійскай балады» В. Быкава, «Птушак і гнёздаў» Я. Брыля, «Лявоніхі на арбіце» А. Макаёнка, твораў А. Кулакоўскага і г. д.

Такія скаргі можна пачуць у многіх і многіх школах. Прычына такога становішча, відаць, і ў мізэрных тыражах кніг на беларускай мове, і ў непаваротлівасці нашага кнігагандлю. Але гэта ўжо — асобная тэма. Той жа факт, што кніг сучасных беларускіх пісьменнікаў няма ў школьных бібліятэках, яшчэ раз сведчыць аб неабходнасці забеспячэння школ нашымі літаратурна-мастацкімі часопісамі: на іх старонках якраз і друкуюцца ўсе лепшыя творы беларускіх празаікаў і паэтаў.

Прыкладаў непрадуманага, а часам і злачыннага падыходу да бюджэтна-ведамаснай падпіскі можна было б прыводзіць вельмі шмат. Усе яны гавораць аб тым, што неабходна змяніць цяперашнюю практыку правядзення падпіскі, калі маладасведчаныя людзі ці асобы, абыякавыя да развіцця нацыянальнай літаратуры і культуры, вырашаюць, што чытаць, а што не чытаць людзям у масавых бібліятэках.

Цяпер распрацоўваюцца новыя рэкамендацыйныя спісы газет і часопісаў для падпіскі ў культасветустановах на 1967 год. Пажадана, каб міністэрствы і ведамствы дэталёва прадумалі гэтыя спісы, падышлі да справы па-новаму, улічваючы сапраўдныя запатрабаванні чытачоў. І, думаецца, трэба зрабіць так, каб гэтыя спісы былі не рэкамендацыйныя, а абавязковыя, якія б мелі сілу закона. Тады, можна спадзявацца, не будзе рабіцца на месцы столькі парушэнняў і злоўжыванняў пры правядзенні важнай дзяржаўнай справы — падпісной кампаніі.

Кастусь ЦВІРКА,
старшы інспектар Упраўлення распаўсюджвання друку Міністэрства сувязі БССР.

ЮБІЛЕЙНЫЯ ВЫДАННІ

«Вожык у дарозе» — так называецца кніга, якая выйдзе з друку ў выдавецтве «Беларусь». У ёй сабраны лепшыя сатырычныя і гумарыстычныя творы беларускіх пісьменнікаў, што друкаваліся на старонках «Вожыка» на працягу 25 гадоў. Сярод іх чытач сустрэне вершы, байкі, фельетоны вядомых паэтаў—К. Крапівы, П. Броўкі, М. Танка, М. Лужаніна, К. Кірэенкі, А. Астрэйкі, А. Зарыцкага, творы празаікаў — Я. Брыля, М. Паслядовіча, Р. Сабаленкі і іншых, а таксама вершы, апавяданні, гумарэскі многіх паэтаў і пісьменнікаў маладзейшага пакалення.

Кнігу на грамадскіх асновах падрыхтавалі да друку супрацоўнікі «Вожыка» паэты Уладзімір Корбан і Генадзь Кляўко.

Другое юбілейнае выданне называецца «Вожыку — 25 год». Гэта альбом малюнкаў мастакоў-карыкатурыстаў. У яго адабраны лепшыя сатырычныя і гумарыстычныя малюнкі, якія друкаваліся ў «Вожыку» з 1941 года па сёлетні год. У альбом уключаны работы старэйшых мастакоў-карыкатурыстаў А. Волкава, М. Гурло, М. Жытніцкага, С. Раманава, В. Цігановіча, мастакоў сярэдняга пакалення Я. Ганкіна, Р. Грамыкі, В. Ждана, З. Паўлоўскага, А. Чуркіна, В. Швяцова, малодшага — Я. Бусла, А. Жыхарэвіча, Л. Чурко, В. Шматава.

С. ДУБРОВА.

ЦІКАВАСЦЬ ДА БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

Добра прапагандуюць работнікі гомельскай бібліятэкі імя Герцэна кнігі беларускіх пісьменнікаў. Яны часта арганізоўваюць дыспуты, канферэнцыі чытачоў, сустрэчы з аўтарамі твораў. Вось і нядаўна ў бібліятэцы выступалі празаік І. Грамовіч і паэты П. Прыходзька і А. Грачанікаў. Да гэтай сустрэчы была падрыхтавана кніжная выстаўка «Беларускія пісьменнікі і сучаснасць».

Работнікі бібліятэкі мяркуюць правесці вечар беларускай паэзіі.

Н. МЯДЗВЕДЗЕВА.

У ВЫДАВЕЦТВЕ «МУЗЫКА»

Жыццё і творчасць беларускіх кампазітараў, гісторыя развіцця беларускай музычнай культуры прыцягваюць увагу працоўных братніх рэспублік. У маскоўскім выдавецтве «Музыка» за апошнія гады быў выдадзены рад кніг, якія расказваюць пра нашу беларускую культуру, пра лепшыя творы, што ўвайшлі ў залаты фонд савецкай музыкі.

Нядаўна ленінградскае аддзяленне выдавецтва «Музыка» выдала нарыс «Яўген Карлавіч Ціноцкі» І. Гусіна. Аўтар расказвае пра жыццё і творчы шлях старэйшага беларускага кампазітара, робіць разгляд папулярных твораў — опер «Міхась Падгорны», «Дзяўчына з Палесся», Другой сімфоніі і іншых.

Днямі гэтае ж аддзяленне выдала «Нарыс па гісторыі савецкай беларускай музычнай культуры» І. Нісневіча і С. Нісневіч. Нарыс складаецца з раздзелаў «Першыя гады беларускай савецкай музычнай культуры», «Беларуская музыка ў дні Вялікай Айчыннай вайны», «Беларуская музыка ў пасляваенныя гады», «Беларуская музыка ў нашы дні». Кніжка багата ілюстравана.

І. ПЯТРОЎ.

ВІНШУЕМ З ГАНАРОВЫМ ЗВАННЕМ

Заслужаны дзеяч мастацтва Беларускай ССР Сяргей Рыгоравіч Раманаў — выхаванец Маскоўскага мастацка - педагагічнага вучылішча. Член Саюза мастакоў БССР.

У час Вялікай Айчыннай вайны прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі. Плённа супрацоўнічаў у газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну». Сатырычныя і гумарыстычныя малюнкі С. Раманава рэгулярна друкуюцца на старонках «Вожыка».

ЭКЗАМЕН У ВУЧЫЛІШЧЫ

Перад пачаткам дзяржаўных экзаменаў навучэнцы Гомельскага музычнага вучылішча імя Н. Сакалоўскага далі для грамадскасці горада канцэрт, які нібы падвёў вынікі іх работы за год. Выступалі сімфанічны аркестр у складзе 42 чалавек, аркестр народных інструментаў, хор, аркестр баяністаў. Сваё майстэрства дэманстравалі спевакі, піяністы, скрыпачы, балалаечнікі. Дырыжыравалі самі выпускнікі.

Вучылішча скончыла сёлета 80 чалавек, дзесяць з іх — навучэнцы гісторыка-тэарэтычнага аддзялення.

Вельмі цікавымі былі выступленні на экзаменах спявачкі А Кулагінай, баяніста Б. Давыдава, які выканаў складанейшы музычны твор Баха, і многіх іншых.

Трэба, аднак, адзначыць, што экзамены выявілі і непадрыхтаванасць асобных навучэнцаў, асабліва на дырыжорска-харавым аддзяленні. Педагогам неабходна звярнуць больш увагі на выпрацоўку слыхавых навыкаў у вучняў, узняць узровень выкладання музычна-тэарэтычных дысцыплін. Варта, відаць, павялічыць кантынгент набору на аркестравае аддзяленне, каб сімфанічны аркестр вучылішча мог і далей плённа працаваць.

Вучылішчу патрэбен інтэрнат, у гэтым яму неабходна аказаць неадкладную дапамогу.

М. БЕРГЕР,
прафесар, заслужаны артыст БССР.

НАПЕРАДЗЕ—ВЯЛІКАЯ ДАРОГА

Вось і надышоў для іх, выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага, урачысты дзень абароны дыпломаў. І хоць многія з іх неаднаразова ўдзельнічалі ў прафесіянальных выстаўках (і трэба сказаць — нярэдка ўдзельнічалі паспяхова), усё ж кожны хваляваўся, кожны перажываў. Хваляваліся і педагогі, і ўсе прысутныя на абароне дыпломаў. Бо гаворка ішла пра мастацтва, пра сапраўднае, надзённае, патрэбнае людзям мастацтва. Дыпломныя работы давалі ўсе падставы для такой сур'ёзнай гаворкі. Нярэдка ўзнікалі спрэчкі і па вузка прафесіянальных, і па агульнамастацкіх праблемах. Што ж, гэта вельмі добры паказчык таго, што інстытут наш не стаіць убаку ад жыцця, што жыццёвая плынь—галоўнае ў пошуках дыпламантаў, якія вось ужо колькі дзён, як выйшлі са сцен інстытута. Цяпер у іх наперадзе — вялікая дарога. І першыя крокі ў гэтай дарозе зроблены.

Прапануем увазе нашых чытачоў нататкі мастацтвазнаўцаў і журналістаў пра работы сёлетніх выпускнікоў інстытута.

ЖЫЦЦЁ ЎЗЫХОДЗІЦЬ НА ПАЛОТНЫ

Выпускнікі жывапіснага аддзялення парадавалі сёлета і разнастайнасцю тэматыкі работ, і—галоўнае—увагай да чалавека, імкненнем глыбока пранікнуць у важныя праблемы нашай гісторыі і нашай сучаснасці. Праўда, пакуль што гэта яшчэ толькі спробы. У некаторых работах за стараннасцю ўсё ж адчуваеш дрыжанне рукі, пакідае жадаць лепшага малюнак, не заўсёды трапляе на месца колер, кідаецца ў вочы нясталасць кампазіцыі і самой задумы палатна. І ўсё ж такія карціны, як «Бежанцы, 1941 год» Я. Ясьвіна, «Хлеб» І. Голубева, «Зямля» В. Бараўко, «Карагод» Н. Голышавай, «Хірургі» Г. Барэйкі сведчаць, што ў наша выяўленчае мастацтва прыйшлі людзі, здольныя многае зрабіць для яго далейшага развіцця. Гэтыя карціны дастаткова глыбокія па задумах і ў пэўнай меры індывідуальныя па выкананню.

Прыемна адзначыць, што з чатырнаццаці прадстаўленых на абарону жывапісных дыпломаў восем прысвечаны тэме нашай сучаснасці. Гэта «Поўдзень» Я. Каробушкіна, «Трывога» П. Свентухоўскага, «Фехтавальшчыкі» В. Есіпава, «Пагранічнікі» В. Гоманавай, «Сям'я» В. Ракоўскага, «Свята» Я. Нячаевай і ўжо названыя карціны Н. Голышавай і Г. Барэйкі. Маладыя жывапісцы апяваюць працу, спорт, нялёгкую службу савецкіх воінаў-пагранічнікаў. Цікавае псіхалагічнае вырашэнне тэмы знайшоў Г. Барэйка ў карціне «Хірургі». У фігурах і тварах урачоў маладому аўтару ўдалося пры знешне спакойных рухах і жэстах выявіць унутраную сабранасць і напружанне людзей, якія ўступілі ў цяжкую барацьбу за жыццё чалавека.

Тэмпераментна і маляўніча, свежа і жыва напісаны Н. Голышавай «Карагод». Дыпламантка здолела згарманіраваць яркія, кантрастныя колеры (задача ў жывапісе не з лёгкіх), перадаць жыццярадаснасць гераінь. Праўда, нельга не сказаць, што ў рабоце адчуваецца ўплыў любімых аўтарам рускіх мастакоў Малявіна і Архіпава.

Апладысментамі шматлюднай залы была сустрэта дыпломная работа Я. Ясьвіна «Бежанцы, 1941 год»— філасофскі роздум маладога мастака аб вайне і людзях, аб іх нялёгкіх і мужных лёсах.

...Абпаленая, абяскроўленая зямля. Крывава-аранжавымі фарбамі пажараў насычаны на далёкім краявідзе маленькі кавалачак неба. А ў бяскрайнім, няўтульным полі згубіліся дзве жанчыны і дзіця, аб'яднаная адным, нялёгкім лёсам...

З работ, прысвечаных воінам-пагранічнікам, трэба адзначыць карціну П. Свентухоўскага «Трывога». Тут выразная кампазіцыя, трывалы, канструктыўны малюнак, удала знойдзена танальнасць работы.

Удалай магла б быць карціна М. Меранкова «Год сорак першы». Супаставіўшы ад'язджаючыя на фронт воінскія эшалоны і жанчын і дзяцей, што стаяць на чыгунцы, мастак, нам здаецца, знайшоў удалую кампазіцыю. Аднак для глыбокага раскрыцця задумы карціне нестае вобразнасці, фігуры і твары людзей напісаны месцамі інертна і недастаткова выразна ў псіхалагічных адносінах.

Запомнілася карціна І. Голубева «Хлеб». У спаленай вёсцы пад адкрытым небам засталася печ. Але людзі вярнуліся на папялішча. Змучаныя вайной дзеці не адводзяць вачэй ад першага бохана цёплага, роднага хлеба, які ў руках маці. Карціна ўдала скампанавана, колер у ёй выступае сродкам раскрыцця ідэйнай задумы. Скупы, шаравата-зялёны каларыт карціны перадае дух часу—першых дзён пасля вызвалення роднай зямлі ад фашысцкай погані.

Добрае ўражанне пакідае работа самага маладога дыпламанта—«Зямля» В. Бараўко. Твор—пра перадачу зямлі ва ўласнасць народа. Стрыманая, аскетычна суровая колерная гама нарадзілася з самой ідэі палатна, а эскізная манера выканання не замінае аўтару стварыць шэраг жыццёва пераканальных, запамінальных вобразаў. Ёсць у рабоце пэўная самастойнасць, ёсць і недакладнасці ў малюнку, і ўсё ж яна цікавая.

Маючы дастатковую прафесіянальную падрыхтоўку, некаторыя дыпламанты, на жаль, не навучыліся яшчэ вобразна мысліць, засяроджваць увагу на галоўным, істотным у кампазіцыі. І гэта прыводзіць іх або да ілюстрацыйнасці («Фехтавальшчыкі» В. Есіпава), або да чужой жанру станковай карціны плакатнай тэндэнцыйнасці («Сям'я» В. Ракоўскага).

В. ШМАТАЎ.

НАСТОЙЛІВАСЦЬ ПОШУКАЎ

Першае, што звяртае на сябе ўвагу ў дыпломах скульптараў гэтага года,— разнастайнасць тэматыкі і жанраў. Галоўным прадметам увагі была сюжэтная кампазіцыя, якая адлюстроўвае рэвалюцыйнае мінулае, гераіку Вялікай Айчыннай вайны і рамантыку сучаснай працы. Спеласць задум—другая вызначальная рыса новых дыпломных работ.

І. Міско глядач ведае як партрэтыста. У дыпломнай рабоце «У суровыя гады» скульптар узяўся за вырашэнне сюжэтнай кампазіцыі з эпохі Вялікай Айчыннай вайны. Маладая жанчына-маці трымае на руках дзіця. Вобраз партызанкі насычаны грамадзянскім пафасам, вабіць чалавечнасцю, жаноцкасцю.

Ул. Папсуеў у невялікай па памерах кампазіцыі «1919 год» адлюстроўвае вобраз маладога будзёнаўца ў шынялі і з вінтоўкаю за плячыма. Будзёнавец рашуча крочыць наперад. Гармонік у яго руках— дэталь, якая падкрэслівае рамантыку эпохі. Асабліва выразны твар чырвонаармейца.

Іначай будуе сваю жанравую дзвюхфігурную групу «Ленін і беспрытульнік» Г. Харлан. Маладога аўтара хвалюе праблема выяўлення логікі ўзаемаадносін, псіхалогіі людзей. Ён акцэнтуе ў сваёй кампазіцыі сур'ёзнасць і ўзаемны давер субяседнікаў. У позе Леніна добра перададзена ўвага да малога, а ў малым—не па гадах сур'ёзная думка.

Рускі геолаг і рабочы-чукча — героі кампазіцыі А. Кузьміных. Яны, як роўныя, упэўнена стаяць на зямлі. Скульптура прызначана для ўстаноўкі ў адным з раённых дамоў культуры на Далёкай Поўначы.

Вобраз сучасніка — свабоднага, гордага, гарманічна развітага чалавека — раскрыты ў рабоце І. Краўчанкі «Пераможца». Скульптара цікавіць не столькі настрой спартсмена-фехтавальшчыка, які выйграў у спаборніцтве, колькі тыповыя рысы нашай сённяшняй моладзі. Менавіта таму вобраз успрымаецца як абагулены, сімвалічны.

Дыпломнікі паказалі таксама партрэтныя статуі, у якіх занатавана аблічча канкрэтных людзей. Сур'ёзнасцю падыходу і вырашэння партрэтнай задачы ўражвае «Максім Багдановіч» С. Вакара, статуя героя абароны Брэсцкай крэпасці камісара Фаміна работы Б. Івонцьева. У апошняй рабоце ў кампазіцыю ўведзена сюжэтнае дзеянне, Фамін паказаны перад расстрэлам. Аўтар падкрэслівае волю і мужнасць героя. Таму, хоць у кампазіцыі перададзены трагічны момант, яна гучыць аптымістычна.

Упэўненасць у светлай будучыні Радзімы асабліва ярка выяўлена ў дэкаратыўнай кампазіцыі А. Арцімовіча «Юнацтва» (або «Бягучыя з птушкамі»). У ёй дадзены абагулены вобраз-сімвал юнацтва, прыгажосці. Сюжэт не ілюструе канкрэтны жыццёвы эпізод, а дае адцягненае выяўленне лёгкасці і імклівасці руху. Паказ на адным узроўні людзей і птушак узмацняе ўражанне акрыленасці бягучых. Кампазіцыя цікавая і сваёй пластыкай, і сувяззю з сучаснай архітэктурай. Работа прызначана для ўстаноўкі ля гасцініцы «Юнацтва» на Мінскім моры.

У поспеху дыпламантаў-скульптараў адбіліся настойлівасць пошукаў новага выканаўцамі работ і чулае, умелае кіраўніцтва вопытных педагогаў кафедры, якую ўзначальвае народны мастак БССР прафесар А. Бембель.

І. ЕЛАТАМЦАВА.

НА ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ

Парадавалі сваім прафесіянальным майстэрствам выхаванцы заслужанага дзеяча мастацтва БССР дацэнта П. Масленікава. Яны працавалі над самымі разнастайнымі творамі, сярод якіх афармленне оперы і драмы, гераічнай камедыі і казкі.

У гэтых работах перш за ўсё захапляе шчырасць, усхваляванасць, непасрэднасць выказвання. Сем выпускнікоў — і ў кожнага сваё.

Дэкарацыі Г. Гафуравай да оперы М. Рымскага-Корсакава «Паданне аб градзе Кіцежы і дзеве Фяўроніі» вабяць перадачай велічы і прастаты рускай прыроды і рускага дойлідства. Звонкасць каларыту, лірызм і паэтычнасць першай карціны змяняецца драматызмам, амаль трагедыйным гучаннем наступных. Г. Гафурава ўдала спалучае эпас і лірыку, гераіку і фантастыку.

Філасофскай думкай, пранікненнем у сутнасць твора вызначаюцца дэкарацыі А. Бурачэўскага да оперы Ш. Гуно «Фауст». Эскізы да оперы не кідкія, але яны вабяць разуменнем твора, удумлівым падыходам да выяўленчай яго трактоўкі, глыбокім пранікненнем у музычную тканіну оперы.

Рамантычную ўзнёсласць, шчырасць нясуць у сабе эскізы дэкарацый Э. Сямёнавай да спектакля «Сірано дэ Бержэрак» Э. Растана. Аўтар добра разумее эпоху, умела выкарыстоўвае сцэнічную пляцоўку, цікава вырашае касцюмы.

У дэкарацыях да оперы М. Рымскага-Корсакава «Залаты пеўнік», выкананых А. Краўчуком, — добрае разуменне рэалістычных традыцый у афармленні рускай казкі, традыцый А. Васняцова і К. Каровіна.

ЁН ПРЫЙШОЎ У СІНЯЗОРНЫ КРАЙ

ДА 60-ГОДДЗЯ АЛЕСЯ ДУБРОВІЧА

Імя Алеся Дубровіча—паэта з плеяды заходнебеларускіх змагароў супраць белапольскага прыгнёту — добра ведаюць у Глыбоцкім раёне. Алесь Дубровіч (сапраўднае яго прозвішча Аляксей Рэдзька) быў нашым земляком. Людзі старэйшыя помняць маладога хлапца-рэвалюцыянера, некаторыя запомнілі, як неўзабаве пасля вызвалення Заходняй Беларусі журналіст з раённай газеты чытаў палымяныя і хвалюючыя вершы аб лукішскай турме. У краязнаўчым музеі Падсвільскай школы кніжка пра пісьменнікаў, якія загінулі ў час вайны, заўсёды разгорнута на той старонцы, дзе змешчана фатаграфія Алеся Дубровіча...

Аляксей Рэдзька нарадзіўся ў 1906 годзе ў вёсцы Каралевічы, у беднай сям'і. На адукацыю сына сродкаў у бацькоў не было, і хлопцу ўдалося закончыць толькі пачатковую школу. Далей ён вучыўся ў школе жыцця, рана стаўшы на шлях рэвалюцыйнай барацьбы. А. Рэдзька любіў кнігі, верыў у сілу паэтычнага слова і сам спрабаваў пісаць вершы. Сваю творчую дзейнасць ён звязаў з рэвалюцыйнай барацьбой у Заходняй Беларусі.

У 1932 годзе Алесь Дубровіч напісаў верш «Мы», у якім ён спрабаваў акрэсліць сваю творчую праграму:

Мы — скрыўджаных
няпраўдай струны.
Адным распялены агнём.
Мы гімн пачуце граем сумны
І славу барацьбе пяём.

Натхненне наша у змаганні
За шчасце новага жыцця.
Мы летуцім аб светлым ранні,
І шмат у песнях пачуцця...

Верш быў надрукаван у часопісе «Літаратурная старонка» — у адным «з трох легальна-камуністычных часопісаў, якія выходзілі ў Вільні ў 1933—1934 гадах і згуртавалі рабочых і сялянскіх песняроў вакол ідэі класавасці і партыйнасці мастацтва», як зазначыў Ул. Калеснік у кнізе «Сцягі і паходнi». У тым жа нумары «Літаратурнай старонкі» была змешчана дэкларацыя групы пісьменнікаў Літаратурнага фронту. Пад дэкларацыяй стаяў подпіс і Аляксея Рэдзькі.

Неўзабаве за супрацоўніцтва ў рэвалюцыйным друку Алесь Рэдзька быў арыштаваны і два з паловай гады правёў у Лукішках — вільнюскай турме для палітзняволеных. Знаходзячыся там побач са сталымі і вопытнымі рэвалюцыянерамі, Алесь Рэдзька піша вершы (змяшчае іх у рукапісным часопісе «Краты» пад псеўданімам Макар), вучыцца, павышае свой ідэйны і культурны ўзровень і яшчэ глыбей усведамляе сацыяльны і нацыянальны ўціск у Заходняй Беларусі, трывала становіцца на пазіцыі марксісцкага светапогляду.

На судовым працэсе над заходнебеларускімі пісьменнікамі ў 1936 годзе Алесь Рэдзька трымаўся як стойкі рэвалюцыянер. Ад гэтага часу і да самага вызвалення Заходняй Беларусі ён піша шмат мэтаімкнёных і страсных вершаў, у якіх гнеўна ганьбуе сацыяльны гвалт і нацыянальны ўціск, рашуча заклікае да барацьбы і марыць аб свабодзе роднага краю. Вершы яго друкаваліся ў часопісах «Беларускі летапіс» і «Калоссе». Максім Танк у адным з пісьмаў выдзяляў Алеся Дубровіча сярод маладых заходнебеларускіх паэтаў як яркі і арыгінальны талент.

У час правакацыйнага судовага працэсу супраць Г. Дзімітрава А. Дубровіч узняў свой голас пратэсту супраць фашысцкай расправы над выдатным балгарскім рэвалюцыянерам. Пад рэдакцыяй Дубровіча выйшла ў свет і некалькі рэвалюцыйных лістовак.

Нягледзячы на цяжкія цэнзурныя ўмовы, А. Дубровіч знаходзіў такія словы, якія даходзілі да шырокага чытача. Шырока вядомы ў народзе быў яго верш «Крапіва», у якім гаварылася пра пакутную долю беларускага сялянства. І калі пра жыццё ў Заходняй Беларусі А. Дубровіч пісаў з болем і гневам, то з асаблівай цеплынёй і любоўю пісаў ён пра «сінязорны край» — пра Савецкую Беларусь, пра СССР — зорную радзіму паэтавых ідэалаў:

...За хмарамі, за горамі
Ёсць сінязорны край.
Іду к яму нязморана—
Гэй, сэрца, марш іграй!

Светлай верай у вызваленне, у лепшае заўтра насычаны вершы «Кіну свае думы», «Пад звон дратоў» і іншыя. У іх рытме — рэха мужных крокаў барацьбіта-рэвалюцыянера, беларускага патрыёта, які хацеў свабоды роднаму краю.

Як і ўсе працоўныя Заходняй Беларусі, з вялікай радасцю сустрэў А. Дубровіч незабыўныя падзеі верасня 1939 года, калі Чырвоная Армія вызваліла нашых адзінакроўных братоў. Ён з энтузіязмам уключаецца ў актыўную работу па ўсталяванню Савецкай улады, працуе ў сялянскім камітэце, а затым прызначаецца сакратаром Галубіцкага сельскага Савета. Але літаратурная ніва цягне маладога паэта. Неўзабаве ён пераходзіць на работу ў вілейскую раённую газету. З вялікім натхненнем Алесь Дубровіч стварае вершы, друкуе нарысы, карэспандэнцыі, піша аб свабодным жыцці, дбае аб пашырэнні культуры ў вёсках, змагаецца за выкананне мерапрыемстваў партыі і ўрада.

На жаль, кароткай была гэта радасць новага жыцця. Фашысцкая Германія вераломна напала на нашу Радзіму.

Паведамленне аб нападзе гітлераўцаў застала А. Дубровіча ў Куранцы, куды ён быў накіраваны ў камандзіроўку. Ён вяртаецца ў родныя мясціны. Разам з бацькам, братамі Дзмітрыем, Васілём і суседам Васілём Капшулем стварае падпольную групу, звязваецца з партызанамі дзеючай тут брыгады імя Суворава. Народныя мсціўцы прабіраюцца ў гарнізоны фашысцкіх катаў, што размяшчаліся ў гарадскім пасёлку Падсвілле, вёсцы Галубічах, горадзе Глыбокім. У атрады партызан паступаюць каштоўныя звесткі аб размяшчэнні сіл ворага, перапраўляюцца зброя, вопратка, харчы.

У пачатку лістапада 1942 года ўся група была арыштавана. Сярод тых, хто гераічна загінуў, быў і Алесь Дубровіч—паэт, рэвалюцыянер, змагар.

«У асобе Алеся Дубровіча,—пісаў В. Таўлай,—наша паэзія страціла паэта значных магчымасцей». Хай жа наш чытач ведае пра гераічны жыццёвы і творчы шлях таленавітага паэта, які аддаў сваё жыццё за Радзіму.

М. БЕЛЬСКІ,
адказны сакратар глыбоцкай раённай газеты «Шлях перамогі».

В. ШАРАНГОВІЧ. Ілюстрацыі да паэмы Я. Купалы «Адвечная песня» (гравюра). (З дыпломных работ выпускніка Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

Паэтычная павэрка

Пятрусь МАКАЛЬ

З НОВЫХ ВЕРШАЎ

НАФТА

Я — нафта.
Я чорнай рабыняй у сховішчы,
Пад прасам адменнай
каменнай пароды
Шукала ў сваім безвыходным
становішчы
Свабоды.
Пластоў цвердалобых вярхоўная сіла
Мяне прыціскала,
каб я прыкусіла
Язык небяспечны падпольнага
полымя,
Якое мне кроў гарачыла і поўніла.
Трымалі мяне ў чорным целе
вякамі,
Вятры нада мной
галасілі ваўкамі,
А я —
акіян,
спрасаваны ў азерцы,
Агонь выбуховы свой
няньчыла ў сэрцы.
Разведчыкі,
перш чым мяне вы адкрылі,
Брылі па паверхні,
як птушкі без крылля,
Тапталі мяне і не зналі тым часам,
Што я —
ваша ўзлётная моц —
пад абцасам...
Я верыла —
скончыцца тэрмін турэмны:
— Хутчэй высякайце ў цямніцы
аконца,
І я, пакідаючы карцэр падземны,
Ад шчасця падскочу
фантанам —
да сонца.
Не быць мне рабыняю болей ніколі,
Праз шчыліну ў глыбах каменных на
волю
Я, нафта, прабілася Афрыкай чорнай
З чырвоным агнём
у душы непакорнай!..

■ ■ ■

Берагі
Ваду бяруць
У рамку,
Каб рака трымалася напрамку,
Каб,
як ранцы,
караблі насіла
Мускулістых пругкіх хваляў сіла.
Ах, рака —
Рука крутога мора,
Ты не знаеш, што такое змора,
Бач, цябе п'янлівасць веснавая
Зноў да хваляванняў падмывае.
Скінуўшы ільдоў счарнелых вечка,
Вырастаеш, быццам з дзежкі цеста.
І табе ўжо, рэчка-быстрацечка,
У сваім зямным улонні цесна...
І куды, нікому невядома, —
У вады няўрымслівасць
сляпая, —
Уцякае з рэчышча,
Як з дому,
Бераг,
Як парог,
Пераступае.
Пабяжыць за край зямлі і неба,
І яе не зацугляць, хоць рэжце.
І няўжо з сябе выходзіць трэба,
Каб знайсці сябе самога ўрэшце?
...Вусце ў мора. Рокатна і гулка
Некалі рахманая рачулка
Бухае, як кулаком у брамку...
Берагі
Ваду бяруць
У рамку.

■ ■ ■

За тыдзень бог зямлю і неба
З такой таропкасцю стварыў,
Што нам пацець вякамі трэба,
Каб неяк знітаваць прарыў...

Свае ўсявышні недаробкі
На плечы нам зваліў, як куль.
Жыццё, нібы пісьмо без кропкі:
Усё пакуль, пакуль, пакуль...

О свет, калі ж цябе мы створым?
Дамы — на час. І мы — на час.
Цябе мы з цемры цягнем к зорам,
Як пераростка ў першы клас.

■ ■ ■

Не кожны ў крытыкі здатны:
Іх пёры цяжкія, як нікі...
Трэба слова «выдатны»
Не зблытаць са словам «вялікі».

Трэба славу бяздомную,
Якую не купіш у краме,
Замацаваць за вядомымі,
Каб маладыя не ўкралі.

За кожнага, хто велічаецца,
Трэба хварэць і трывожыцца.
Штосьці то вылічаецца,
То дадаецца, то множыцца.

Фарбы наносяцца ладна,
Нібы на твары касметыка,
Размеркаваны дакладна:
Крытыка — як арыфметыка!

Крытыка — мудрасць гнуткая,
Яна і суддзя, і прарочыца.
Можа, і з алгебрай хутка
Ёй падружыць захочацца.

Жадаем удач свядома ёй,
Няхай яе пёры не тупяцца,
Калі да задач з невядомымі
Нарэшце яна падступіцца.

Народ кніг

НЕПРАТАПТАНЫМІ СЦЕЖКАМІ

Манаграфія А. Мальдзіса «Творчае пабрацімства» прысвечана даследаванню сувязей беларускай і польскай літаратур мінулага стагоддзя.

Асэнсоўваючы асаблівасці літаратурных і культурных узаемасувязей двух братніх народаў, аўтар перагледзеў многія старонкі гісторыі новай беларускай літаратуры, яе вытокаў, яе першых крокаў. Ён правільна адзначае, што станаўленне новай беларускай літаратуры цяжка ўявіць без сяброўскай падтрымкі рускай і польскай дэмакратычнай думкі і што ў сваю чаргу беларускі фальклор жывіў творчасць такіх буйнейшых польскіх пісьменнікаў, як Міцкевіч, Крашэўскі, Сыракомля і інш., жыццё якіх так ці інакш было звязана з Беларуссю.

А. Мальдзіс у даследаванні не выбірае пратаптаных сцежак, і калі сабраныя ім факты даюць яму падставу, смела абвяргае старыя, прывычныя меркаванні, уступае ў палеміку. Так, напрыклад, раней у беларускім літаратуразнаўстве быў распаўсюджаны погляд, згодна з якім Баршчэўскага і Рыпінскага безагаворачна адносілі да стану рэакцыі; празмерна таксама акцэнтавалася ўвага на кансерватыўных момантах у спадчыне Чачота. У сувязі з гэтым даследчык адзначае: «Калі зыходзіць з асаблівасцей польскага вызваленчага руху, у якім усе яны ўдзельнічалі, з аналізу не толькі беларускіх, але і польскіх твораў, то стане відавочным, што ў спадчыне Баршчэўскага, Рыпінскага і Чачота ёсць многа дэмакратычнага, накіраванага супраць нацыянальнага і сацыяльнага ўціску».

Ацэнка поглядаў Чачота і Баршчэўскага сведчыць аб уменні аўтара грунтоўна аналізаваць літаратурныя помнікі і рабіць адпаведныя вывады. Затое разгляд ідэйных пазіцый А. Рыпінскага нельга не прызнаць у нейкай ступені аднабаковым. Калі можна станоўча ацаніць яго спачувальныя адносіны да беларускага сялянства, то нельга прыняць яго поглядаў па нацыянальнаму пытанню. Разумеючы, што беларусы ў этнічных адносінах адрозніваюцца ад палякаў, Рыпінскі тым не менш марыў аб тым, каб беларускі мужык навучыўся не толькі чытаць і пісаць, але і думаць папольску. Разглядаючы гэтае пытанне, мабыць, недастаткова будзе абмяжоўвацца толькі заўвагай пра тое, што Рыпінскі «памылкова абвяшчаў Беларусь неад'емнай часткай Польшчы».

Першыя два раздзелы кнігі («Пад сцягам народнасці і рамантызму» і «Напярэдадні паўстання») ахопліваюць перыяд ад пачатку XIX ст. да паўстання 1863 г. (тут не разглядаецца толькі творчасць Дуніна-Марцінкевіча, якому прысвячаецца спецыяльны, трэці раздзел) і расказваюць пра дзейнасць Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага, пра А. Вярыгу-Дарэўскага, В. Каратынскага, У. Сыракомлю і іншых. З уплывам польскай літаратуры А. Мальдзіс звязвае, у прыватнасці, такія асаблівасці іх творчасці, як згладжванне класавых супярэчнасцей, ідэалізацыя гістарычнага мінулага. Для характарыстыкі пісьменнікаў ён шырока выкарыстоўвае іх польскія творы, як правіла, невядомыя нашаму чытачу.

Вялікая ўвага—і гэта зусім заканамерна—удзяляецца В. Дуніну-Марцінкевічу. Пра яго шмат пісалі нашы даследчыкі. Тым не менш А. Мальдзіс змог сказаць сваё слова. Уважліва даследаваўшы літаратурнае асяроддзе, у якім жыў пісьменнік, польскую літаратуру XVIII і XIX стагоддзяў, ён прыходзіць да высновы, што «ў творчасці Марцінкевіча спалучаліся элементы розных мастацкіх напрамкаў—класіцызму, сентыменталізму, рамантызму, урэшце, крытычнага рэалізму. У адной «Ідыліі» ці «Гапоне» адначасова праявілася тое, што іншыя літаратуры перажылі паасобку на працягу дзесяцігоддзяў і стагоддзяў. Такое спалучэнне, відаць, характэрная асаблівасць літаратур XIX ст., якія адсталі ў сваім развіцці».

Сказана правільна, але думка не даведзена да канца. У літаратурнай спадчыне пісьменніка сапраўды адчуваецца арганічны сінтэз класіцызму, сентыменталізму, рамантызму з яго захапленнем паданнямі, фальклорнай паэтыкі. Але ўсё гэта ўтварае адзіны, непадзельны сплаў, які неапраўдана было б расчляняць на паасобныя элементы і які развіваўся ў напрамку да рэалізму, а не да рамантызму, і таму наўрад ці можна назваць метад Дуніна-Марцінкевіча, хоць і ўмоўна, як гэта робіць А. Мальдзіс, «дарамантызмам», або «прадрамантызмам».

Тут жа хочацца запярэчыць і супраць аднаго новаўвядзення. Даследчык пераіменаваў «Сялянку» Дуніна-Марцінкевіча ў «Ідылію». Праўда, падставу для гэтага ён меў: «Sielanka»—так першапачаткова называўся гэты твор—у перакладзе на беларускую мову значыць «ідылія». Але адсюль зусім не вынікае, што трэба на гэтай падставе аўтаматычна замяніць і назву камедыі. Назва «Сялянка» не толькі захоўвае гучанне арыгінала, але, думаецца, і больш адпавядае зместу твора.

Цяжка згадзіцца і з вывадам аб уяўным трагізме і супярэчлівасці ў светапоглядзе пісьменніка: «Трагізм Марцінкевіча заключаўся ў тым, што ён, разумеючы бясплённасць сваіх пошукаў, усё ж «з запаленай свечкай» шукаў гэты ідэал «добрага» пана... Перад аўтарам «Гапона» стаяла невырашальная дылема: вызваленне сялян было немагчыма без абуджэння нянавісці да шляхты, але абуджаць нянавісць да шляхты было нельга, бо яна адначасова выступала як найпершы вораг царскага самадзяржаўя, апоры прыгонніцкай сістэмы...» Сказана так, быццам Дунін-Марцінкевіч мог дапусціць думку аб «абуджэнні нянавісці да шляхты». Пра гэта правільна пісаў яшчэ ў 1915 годзе Янка Купала: «Марцінкевіч, сам шляхціц, шчыра стаяў на варце інтарэсаў гербоўнай шляхты паноў і хаця бачыў усе іх недахопы, усё ж такі ў сваіх творах выказваў думку, што ўся бяда беларускай беднаты паходзіць не ад паноў, а ад панскіх слуг: аканомаў, цівуноў і іншай марноты».

Недастаткова пераканаўча аўтар манаграфіі спрабуе апраўдаць слабыя бакі поглядаў К. Каліноўскага. Адзначыўшы, што за ідэалізацыю Рэчы Паспалітай гэтага выдатнага рэвалюцыянера папракалі М. Цікоцкі, А. Смірноў, Г. Кісялёў і інш., А. Мальдзіс заўважае: «Між тым ідэалізацыя была арганічнай часткай ідэалогіі польскага нацыянальна-вызваленчага руху, мела глыбокія карэнні ў рэчаіснасці... Праслаўленне былога на старонках «Мужыцкай праўды»—гэта традыцыйны для польскага друку прыём агітацыі». Хай сабе гэты прыём лічыцца традыцыйным, але калі ён не адпавядае нацыянальным інтарэсам беларускага народа, нам няма патрэбы яго апраўдваць.

Чацвёрты, апошні раздзел кнігі —«На схіле стагоддзя»—прысвечаны пераважна творчасці Багушэвіча, Лучыны і многіх іх сучаснікаў. А. Мальдзіс разглядае беларуска-польскія сувязі не як з'яву ізаляваную, а як частку больш шырокіх беларуска-рускапольскіх узаемаадносін. Ён прыводзіць цікавыя звесткі аб тым, як беларускія і польскія пісьменнікі, ураджэнцы Беларусі — Жалігоўскі, Белаблоцкі, Кіркор, затым Лучына, Гурыновіч і іншыя—знаёмілі польскіх чытачоў з дасягненнямі рускай і беларускай літаратур, а творы польскіх пісьменнікаў перакладалі на рускую мову.

Усё больш сталай рабілася наша літаратура, і ўзаемадзеянне літаратур набывала новыя рысы. Францішак Багушэвіч не пераймае, а стварае сваё, арыгінальнае, абапіраючыся на ўласныя назіранні жыцця або адштурхоўваючыся ад чужога. Ён «пераасэнсоўваў чужое, часта ўступаючы з ім у палеміку і адмаўляючы яго. Складаецца ўражанне, што некаторыя гутаркі і вершы беларускага паэта ўзніклі нават з нязгоды з той ці іншай думкай яго папярэдніка». Гэтая думка пацвярджаецца параўнаннем некаторых твораў Багушэвіча і Сыракомлі або Поля...

У сваёй манаграфіі даследчык прывёў новыя факты, паказаў жывых людзей, якія тварылі беларускую літаратуру, закладвалі падваліны пад беларускую нацыянальную культуру. Кніга «Творчае пабрацімства» побач з работамі Г. Кісялёва і іншых даследчыкаў значна ўзбагачае нашы веды аб беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

Ул. КАЗБЯРУК.

А. Мальдзіс. «Творчае пабрацімства». Выдавецтва «Навука і тэхніка», Мінск, 1966.

І. Лагунова аформіла «Пікавую даму» П. Чайкоўскага. Яна выявіла разуменне музычнай драматургіі твора, напружанасць і драматызм. Удала перададзена ў дэкарацыях трагедыя чалавека, жыццё якога абарвалася.

А колькі вастрыні і паэтычнасці, усхваляванасці ў дэкарацыях Г. Івакіна да «Босай птушкі» М. Волінай!..

Разнастайнасць жанраў, шырыню творчых пошукаў прадэманстраваў Б. Герлаван. Яго дэкарацыі да «Мешчаніна ў дваранстве» Ж. Мальера, оперы В. Мурадэлі «Кастрычнік», казкі «Адалень-трава» сведчаць аб высокім узроўні прафесіянальнага майстэрства мастака, аб глыбокім разуменні жанру і стылю твора, аб веданні законаў сцэны.

Дарэчы будзе сказаць, што многія з эскізаў, якія абараняліся, мы ўжо бачылі ажыццёўленымі на сцэне. Хочацца верыць, што мы хутка ізноў сустрэнем у тэатрах работы дыпламантаў гэтага года.

Мушу сказаць яшчэ пра аднаго мастака, не звязнага з тэатрам. Мы ўбачылі цікавыя дэкаратыўныя тканіны бытавога прызначэння — работы выпускніка аддзялення мастацкага афармлення тканін і вырабаў лёгкай прамысловасці Р. Апцекіна. Дыплом быў станоўча ацэнены. Аўтару выказана адно пажаданне — смялей уводзіць у свае работы матывы беларускага выяўленчага фальклору і сучасныя беларускія матывы.

П. КАРНАЧ.

ІХ БЫЛО ТРЫНАЦЦАЦЬ

Чортаў тузін для выхаванцаў П. Любамудрава аказаўся лічбаю шчаслівай. Даўно ўжо на кафедры графікі не было такога ўраджайнага года, як сёлетні. Работы дыпламантаў пераканаўча паказалі, што кожны з іх мае права называцца гордым словам — мастак.

Васьмёра абаранілі дыпломы ў галіне кніжнай графікі. Тут якраз удачы былі асабліва яркія. Тры выдатныя ацэнкі з чатырох, атрыманых графікамі, належаць якраз «кніжнікам» — В. Шаранговічу, А. Дэмарыну, Э. Агуновічу.

В.Шаранговіч стварыў гравюры да купалаўскіх паэм «Адвечная песня» і «Адплата кахання». Дыпламант бліскуча валодае матэрыялам. Яго лісты ўражваюць адмысловасцю спалучэнняў чорнага і белага, яны сапраўды дэкаратыўныя. Лісты «Маці», «Сейбіт», «Зямля» даюць абагулены вобраз Беларусі.

У інакшым ключы ілюстраваў «Угрум-раку» В. Шышкова А. Дэмарын. Працуючы над ілюстрацыямі, мастак наведаў Сібір, зрабіў шмат замалёвак. Адсюль тая пераканаўчасць яго ілюстрацый, якая дае падставы сцвярджаць, што ён не проста «акампаніятар» тэксту. Атмасфера твора, вобразы яго герояў перададзены вельмі пераканальна.

Вось Прохар з ваўком. Вялізны. Прыгожы. Вось Анфіса. Якраз такімі ўяўляем мы іх, чытаючы твор.

Парадаваў сваім дыпломам Э. Агуновіч. Яго «Тарас на Парнасе» вылучаецца разуменнем народнага гумару — кожны ліст дыхае іскрамётнай весялосцю. Няма ў вобразах афортаў Агуновіча ні драбніцы алімпійскай велічы — усё як на добрым сялянскім двары: у дыміну захмялелы Зеўс, ззяючая мажная дзеўка Венера, зухавата пусціўся ў скокі Тарас, а тут жа, убаку, нейкая з багінь, зацісну́ўшы пад пахаю Амура і моцна трымаючы за крыло, аходжвае яго па пульхным азадку...

На жаль, дастаткова глыбокага пранікнення ў стыль аўтара не атрымалася ў работах М. Пракапенкі, які ілюстраваў «Ліку» І. Буніна. Яго серабрыста-шэрыя лісты, выкананыя ў змяшанай тэхніцы, аснову якой складае манатыпія, нам здаецца, не заўсёды дасканалыя па малюнку.

Работы Ул. Мазалёва (кампазіцыі на тэму кнігі В. Ратава «Зоры над Руссю»), А. Салькова (ілюстрацыі да рамана «Георгій Скарына» М. Садковіча), В. Кандэра (афорты на тэмы «Магілы льва» Я. Купалы) абагулена стылізаваныя, дабротныя па выкананню. Прыгожыя пастэльныя і гуашавыя лісты да «Малдаўскіх балад» дыпламанта В. Каракіна.

У графікаў-станкавістаў выдатна ацэнены лісты Р. Маліноўскага — серыя літаграфій аб Леніне. Дыпламант паставіў перад сабой вельмі складаную задачу і досыць паспяхова справіўся з ёю. Аднак кідаецца ў вочы, што сувязь між лістамі чыста фармальная, цэласнага адзінства ў рабоце не адчуваецца.

Серыя гравюр Эльмаса Гусейнава «Нафтавыя каменні» — гэта творы аб радасці працы, аб людзях, якія скарылі стыхію. Гравюры гучаць як гімн працы.

І. Капеляна — аўтара серыі лінагравюр на тэму «Вайна і дзеці» можна папракнуць у некаторай сентыментальнасці. Лісты гэтыя простыя па манеры выканання, лаканічныя. Аўтар не шукаў складанай формы, для яго галоўнае — змест. Але калі лісты «Ноч», «Зорка», «Цішыня» — добрыя, глыбокія, дык «Вясна» і «Мужнасць» значна саступаюць ім.

Абаронены і адзін дыплом па прыкладной графіцы — Р. Дубелір прадставіў афармленне даведніка па Мінску, зборніка песень «Радзіма мая дарагая» і оперных клавіраў да «Аіды» і «Рыгалета». Гэта першая ластаўка ў прыкладной графіцы, і таму яна радуе.

М. ГАРЭЦКАЯ.

□ □ □

Сям'я беларускіх мастакоў вырасла. Наперадзе ў дыпламантаў Беларускага тэатральна-мастацкага—вялікая дарога. Дык няхай жа, узбагаціўшы творчай практыкай усё тое добрае, што дала ім школа, аддадуць яны свой талент народу, роднай краіне, якая жывіць іх творчасць са сваіх невычэрпных крыніц.



...Я душою ажываю,
Як вокам мыслі азіраю
Цябе, мой луг і бераг родны,
Дзе льецца Нёман срэбраводны,
Дубы дзе дружнай чарадою
Стаяць, як вежы, над вадою...

Якуб КОЛАС.

РОДНЫ КУТ НАРОДНАГА ПЕСНЯРА

МІКАЛАЕЎШЧЫНА... Хто не ведае гэтай цудоўнай, шчодра адоранай прыродай вёскі, якая дала свету народнага песняра Беларусі Якуба Коласа! Раскінулася яна на высокім маляўнічым беразе паўнаводнага Нёмана. Сасновыя лясы, пясчаныя палі, заліўныя лугі акружаюць яе. Гэта пра яе пісаў народны паэт:

Мой родны кут, як ты мне мілы...
Забыць цябе не маю сілы!

Тут, у Мікалаеўшчынскай пачатковай школе, у 1892 годзе (адкрыта школа была ў 1866 г.) Якуб Колас пачынаў вучыцца. Праз некалькі год пасля яе заканчэння ён пісаў: «Калі каму з вас, саколікі, здарыцца быць у нашых завулках, то не пашкадуйце патраціць колькі часу і зайдзіце палюбавацца на нашу школу.

Мне здаецца, што самы хітры на выдумкі штукар не прыдумаў бы болей злоснага насмяхання над народнай асветай, як пастроіць гэтакую школу».

Цяпер жа сярод добраўпарадкаваных дамоў Мікалаеўшчыны горда ўздымаецца белакаменны двухпавярховы будынак дзесяцігодкі. Школа пабудавана па ініцыятыве Якуба Коласа і названа яго імем. Тут свята ўшаноўваюць памяць народнага паэта-земляка. З дапамогай настаўнікаў вучні стварылі школьны музей Якуба Коласа. У ім сабраны цікавыя фотаздымкі і дакументы, выданні кніг паэта, матэрыялы аб яго жыцці, творчасці і грамадскай дзейнасці. Саюз пісьменнікаў Беларусі арганізаваў для музея збор кніг з аўтографамі пісьменнікаў.

«Школе імя Якуба Коласа (у в. Мікалаеўшчыне) з любасцю да зямлі, што нарадзіла вялікага паэта»,—так напісаў Пімен Панчанка на сваім зборніку вершаў «Пры святле маланак».

Звонкая ліра таленавітага земляка натхняе на паэтычныя пошукі юных паэтаў Мікалаеўшчыны, і яны спрабуюць свае сілы ў літаратуры.

Абагароджаная лясамі,
З рыпам калодзежаў,
Жнеяй галасамі,
З азярынамі ў белым тумане
Выплыла Мікалаеўшчына
На сенажацей зялёным экране,—

так пачынае свой верш «Мікалаеўшчына», прысвечаны Якубу Коласу, Мікола Маляўка — малады паэт, першая кніга якога зусім нядаўна выйшла ў выдавецтве «Беларусь».

Іх шмат на Мікалаеўшчыне — і тых, хто яшчэ толькі спрабуе свой голас, і тых, хто ўжо нядрэнна заявіў аб сабе ў рэспубліканскім друку: Я. Хвалей, А. Камароўскі, М. Дземідовіч, Д. Мароз, М. Камароўскі, А. Аляшкевіч, В. Сянкевіч, Д. Міцкевіч. Пачынаючыя літаратары Мікалаеўшчыны групуюцца ў літаратурным аб'яднанні «Маладыя каласкі», якое створана ў школе імя Якуба Коласа. Яны рэгулярна выпускаюць насценгазету «Наднёманская рунь», дзе змяшчаюць свае вершы, апавяданні, гумарэскі. Кіруе літаратурным аб'яднаннем вялікі любіцель роднай літаратуры дырэктар школы А. І. Каменка.

У пачатку гэтага года «Наднёманская рунь» аб'явіла агульнашкольны конкурс на лепшыя літаратурныя творы, прысвечаныя 50-годдзю Савецкай улады і 100-годдзю школы. Стогадовы юбілей Мікалаеўшчынскай школы — гэта свята не толькі мікалаеўцаў і жыхароў навакольных вёсак. Думаецца, што гэта свята ўсіх тых, хто хоць калі-небудзь прычасціўся да бяздоннай крыніцы мудрасці і прыгажосці, што б'ецца ў цудоўных творах Якуба Коласа.

У гэтым годзе мікалаеўцы адзначаюць і другую знамянальную дату, значэнне якой выходзіць далёка за межы вёскі, — 60-годдзе шырока вядомага ў Беларусі нелегальнага настаўніцкага з'езда, які адбыўся 9 ліпеня 1906 года ў Мікалаеўшчыне і ў якім прымалі ўдзел Якуб Колас і Янка Маўр. Родны кут народнага песняра чакае шматлікіх гасцей, якія павінны прыехаць на святкаванні юбілеяў.

Э. КАРНІЛОВІЧ.

У НЯДЗЕЛЮ — ДЗЕНЬ РЫБАКА

Шмат на Беларусі блакітных азёраў, паўнаводных рэк. Гэта не толькі прыгажосць роднага краю, а і яго багацце. На сінюю Нарач і на Браслаўскія азёры, на Сож і Прыпяць, на Дняпро і Бярэзіну выплываюць на лоў людзі рамантычнай прафесіі—рыбакі. Прафесіяналы і аматары. І якая радасць у рыбака, калі ён вяртаецца з добрым уловам! Вось і брыгадзір брыгады камуністычнай працы Лоеўскага ўчастка Мікалай Далбенка задаволены—цудоўная рыбка трапіла ў сетку. Летась налектыў рыбакоў, які ён узначальвае, здаў дзяржаве 18 тон рыбы. А сёлета мяркуе здаць яшчэ больш—25 тон.

Паслязаўтра брыгада Мікалая Далбенкі будзе адзначаць сваё свята—Дзень рыбака. І сустракаюць лоеўскія рыбакі гэты дзень новымі поспехамі ў працы.

На здымку вы бачыце Мікалая Далбенку (злева) і рыбака Івана Ніцко пасля багатага ўлову.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ. (БЕЛТА).

ГУТАРКІ, СУСТРЭЧЫ, ДЫСКУСІІ

Трэці дзень на беразе сіняй Нарачы працуе рэспубліканскі семінар творчай моладзі.

Шостага ліпеня перад маладымі літаратарамі, кампазітарамі, мастакамі, кінематаграфістамі, выканаўцамі выступіў намеснік начальніка Дзяржплана БССР П. І. Шварцбург, які расказаў аб перспектывах развіцця эканомікі рэспублікі, аб новай пяцігодцы Беларусі.

У той жа дзень удзельнікі семінара сустрэліся з намеснікам старшыні Камітэта па радыё і тэлебачанні пры Савеце Міністраў БССР М. Пятніцкім, міністрам культуры рэспублікі М. Мінковічам, намеснікам старшыні Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР А. Барушкам.

Увечары на семінары быў наладжан прагляд новага фільма вытворчасці «Беларусьфільм» «Іду шукаць» (рэжысёр І. Дабралюбаў).

Учарашні дзень работы семінара быў прысвечаны тэме «Камунізм і эстэтычнае выхаванне». Перад удзельнікамі семінара выступілі дацэнт БДУ імя Ул. І. Леніна М. Крукоўскі, кандыдат філасофскіх навук І. Пал, пісьменнік К. Шнэй-Красікаў. Учора ж творчая моладзь сустрэлася са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, якія адпачываюць у студэнцкім спартыўным лагеры на возеры Нарач.

Удзельнікі семінара, падзяліўшыся на тры брыгады, наладзяць творчыя вечары ў Мядзелі, Свіры і ў калгасе «Змагар» Мядзельскага раёна.

У рабоце семінара прымаюць удзел А. Макаёнак, маскоўскі паэт Б. Шахоўскі, намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Молодая гвардия» Ул. Мілюценка, кандыдат мастацтвазнаўства з Масквы К. Сцяпанава, сакратар ЦК ЛКСМБ А. Ваніцкі.

Сёння на семінары—дзень літаратуры.

З ПЕСНЯМІ Ў ЛІТВУ

У братняй Літве праводзяцца фестывалі народнай песні, прысвечаныя дружбе народаў СССР. Гэтымі днямі ў Друскенінкаі пабывалі спевакі гродзенскага ансамбля «Нёман». Беларускія самадзейныя артысты выканалі на фестывалі беларускія і літоўскія песні, народныя танцы.

У Клайпедзе літоўскія сябры цёпла сустрэлі вакальную і танцавальную групы Гродзенскага раённага Дома культуры.

У горад Плунгес, дзе неўзабаве адбудзецца такі фестываль, запрошаны калектыў Берастовіцкага Дома культуры.

IX З'ЕЗД АРХІТЭКТАРАЎ БССР

ПРАЕКТАВАЦЬ ПА-СУЧАСНАМУ, БУДАВАЦЬ ВЫСАКАЯКАСНА

СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Дакладчык гаворыць пра эстэтычны ўзровень новых архітэктурных комплексаў, пра тое, што многія сучасныя гарады невыразныя, аднастайныя.

— Практыка паказала, — зазначае ён, — што ў стандарта ёсць і свой адмоўны бок. Калі стандартам карыстацца няўмела, ён ператвараецца ў штамп — з'яўляецца аднаго тыпу дом, адзін тып кватэр, мноства канструктыўных вузлоў і дэталей, замяніць якія адна другой практычна немагчыма. Такая стандартызацыя ператварыла архітэктара ў свайго раба. Тэхналогія заводскага вырабу дамоў не дае магчымасці спыніць і пераабсталяваць домабудаўнічыя прадпрыемствы — гэта прывядзе да зрыву дзяржаўных планаў будаўніцтва. Каб выправіць становішча, неабходна прыцягнуць архітэктараў да сумеснай працы з тэхнолагамі і будаўнікамі на домабудаўнічых камбінатах і на будаўнічых пляцоўках.

Сёння мы пачалі лепш будаваць жылыя дамы. У іх створаны больш спрыяльныя ўмовы для жыцця. Паспяхова праектуюцца высокія дамы. Ужо некалькі гадоў даследуецца і правяраецца на практыцы тэхналогія будаўніцтва дамоў з аб'ёмна-прасторавых элементаў. Тут паспяхова працуюць архітэктары М. Ліўшыц, А. Духан, Э. Левіна, Ю. Шпіт, Н. Шпігельман, Ул. Пушкін, Ул. Цямноў, Д. Кудраўцаў, М. Барсукоў, І. Папова.

Важную ролю ў фарміраванні архітэктурнага аблічча нашых гарадоў адыгрываюць грамадскія будынкі. За апошнія гады намеціўся відавочны прагрэс у іх будаўніцтве. Да лікавых буйных сучасных грамадскіх будынкаў можна аднесці Палац спорту ў Мінску (архітэктары С. Філімонаў і В. Малышаў), будынак Мінскага гарсавета (С. Мусінскі і Г. Сысоеў), Палац культуры камвольнага камбіната (С. Мусінскі), кінатэатр «Піянер» (Г. Заборскі і Л. Левін), Інстытут замежных моў (Н. Шпігельман і І. Есьман), Дом партасветы ў Брэсце (Л. Маскалевіч), кінатэатр у Светлагорску (В. Анікін) і інш.

Архітэктары шмат увагі аддаюць праектаванню грамадскіх будынкаў для жылых масіваў. Яны распрацоўваюць і ўкараняюць каркасна-панельныя дзіцячыя сады (Н. Шпігельман, І. Есьман), выяўляюць новыя тыпы школ (Л. Гальдштэйн). Рыхтуюцца праекты буйных будынкаў — адміністрацыйных, грамадскіх, навучальных, навукова-даследчых і г. д.

Далей дакладчык спыняецца на якасці будаўнічых работ.

— Органы, якія плануюць і фінансуюць будаўніцтва, — гаворыць ён, — сёння забараняюць ужываць даўгавечныя традыцыйныя будаўнічыя матэрыялы. Большасць заказчыкаў звычайна клапоціцца толькі пра ўяўны эканамічны эфект. І сапраўдная эканамічнасць падмяняецца капеечнай эканоміяй на шкоду якасці, а пераробкі ў праектах, у ходзе будаўніцтва і капітальных рамонтаў дорага каштуюць дзяржаве.

На выстаўках мы часта бачым цудоўныя сучасныя аздабляльныя матэрыялы. Але створаецца ўражанне, што іх робяць толькі для выставак.

Якасць нашага будаўніцтва ўсё яшчэ не адпавядае сучасным патрабаванням. У нас нездавальняючая якасць будаўнічых матэрыялаў, дэталей і канструкцый. Гэта ў першую чаргу датычыць зборнага жалезабетону, які стаў асновай індустрыяльнага, жыллёвага, прамысловага і сельскагаспадарчага будаўніцтва. Мала добрых матэрыялаў дае наша прамысловасць для аздаблення фасадаў, кватэр і інтэр'ераў грамадскіх будынкаў. Дзяржплан і Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў БССР, відаць, не хочуць сур'ёзна займацца аздабляльнымі матэрыяламі. У вырашэнні пытання немалую ролю павінна адыграць, на наш погляд, ініцыятыва Дзяржбуда.

— Нельга не адзначыць, — гаворыць далей дакладчык, — небяспекі штампу, які пачынае намячацца ў радзе збудаванняў як у аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, так і ў вонкавай трактоўцы будынка. У апошні час архітэктары захапляюцца ўжываннем шкла ў жылых, навучальных, навуковых установах, не ўлічваючы патрабаванняў функцыянальнасці. Трэба больш пільна прыглядацца да праектавання адміністрацыйных і грамадскіх будынкаў, што робяцца ў каркасна-панельных канструкцыях. Пошукі тут, як нам здаецца, не заўсёды ідуць па правільным шляху. Нас трывожыць, напрыклад, модная сёння плынь: рабіць будынкі, чаргуючы бетон і шкло. Ці не вяртаемся мы да эталону дваццатых гадоў, да «эстэтычнага прымітыву», у той жа час імкнучыся пераканаць сябе, што ідзём у нагу з сучаснасцю? Падобныя ўзоры можна сустрэць у архітэктуры жылых дамоў, гасцініц, бальніц, навучальных устаноў.

Дакладчык адзначае вялікую работу архітэктараў «Белпрампраекта», «Белгіпрасельпраекта», гаворыць аб паспяховай распрацоўцы праектаў прамысловых вузлоў у радзе беларускіх гарадоў.

У прамысловай архітэктуры сур'ёзную ўвагу сталі аддаваць эстэтыцы. Удала створаны інтэр'еры ў зборачным корпусе Мінскага гадзіннікавага завода, на Брэсцкім дывановым камбінаце і інш.

— У гэтым годзе, — гаворыць дакладчык, — заканчваецца распрацоўка схем раённай планіроўкі першага этапа па ўсёй тэрыторыі рэспублікі. У выніку па ўсіх калгасах і саўгасах вызначана размяшчэнне перспектыўных населеных пунктаў, жывёлагадоўчых ферм і іншых вытворчых комплекстаў. Схемамі і праектамі планіроўкі забяспечана да 80 працэнтаў калгасаў і 40 працэнтаў саўгасаў. Па генеральных планах, тыпавых праектах будуюцца новыя пасёлкі — калгасы імя Калініна, «Гвардыя», саўгасы «Волма», «Камунар» і інш.

— Неабходна адзначыць, — заўважае дакладчык, — што прапановы па перспектыўнаму будаўніцтву часта не даводзяцца да ведама гаспадарак. А гэта нярэдка вядзе да няправільнага размяшчэння новых буйных збудаванняў. Нас яшчэ не задавальняюць тыпавыя праекты будынкаў культурна-бытавога прызначэння, многія з якіх па сваёй архітэктуры малавыразныя.

Э. Дзямідаў падкрэслівае, што архітэктар мае многа сродкаў мастацкага выяўлення. І вялікую ролю павінен адыгрываць сінтэз мастацтваў. Аднак да гэтага часу мы не маем упарадкаванай сістэмы планавання, фінансавання, праектавання і ўключэння скульптуры і жывапісу ў архітэктуру. Дэкаратыўныя і манументальныя творы ва ўнікальных будынках з'яўляюцца вельмі рэдка. А яны ж павінны быць і ў школах і дзіцячых садах, якія фарміруюць густ і светапогляд дзяцей, і ў вытворчых і грамадскіх установах, дзе праходзіць значная частка нашага жыцця, у кафэ, рэстаранах і г. д.

Да гэтага часу няма пастаяннага дзелавога кантакту ў рабоце архітэктара і мастака. Нашы праектныя арганізацыі не могуць прыцягваць да распрацовак праектаў скульптараў і мастакоў. Таму ў самы бліжэйшы час павінны быць знойдзены арганізацыйна-фінансавыя формы сумеснай работы архітэктараў і мастакоў. Гэтая работа павінна весціся па-дзяржаўнаму, у планавым парадку, з улікам абсалютнай каардынацыі ўсіх работ у гэтай галіне.

Далей дакладчык гаворыць пра павышэнне аўтарытэту і адказнасці архітэктара. Архітэктар па ідэі — галоўны будаўнік. Аднак сёння яму, аўтару праекта, каб убачыць свой твор ажыццёўленым згодна з задумай, трэба прайсці цярністы шлях. У яго работу ўмешваюцца шматлікія інстанцыі, што ўзгадняюць і зацвярджаюць праект. Уносяць «паляпшэнні» санітарная і пажарная інспекцыі, розныя тэхнічныя, архітэктурныя і іншыя саветы. У выніку праект часта траціць індывідуальнасць, а аўтар — свой творчы почырк. Неабходна зрабіць, каб аўтар праекта, архітэктар, узначальваў камісію па прыёмцы будынка. Гэта значна ўзніме яго аўтарытэт.

— У нас перасталі лічыць архітэктуру мастацтвам. І настаў час, калі трэба пра гэта гаварыць на поўны голас. Трэба падымаць аўтарытэт архітэктараў, не займацца дробязнай апекай, падтрымліваць іх рашэнні, памагаць архітэктурнай творчасці.

Шмат яшчэ недахопаў у прапагандзе архітэктурных ідэй, — падкрэслівае далей дакладчык. — І наша задача памагчы людзям зразумець сутнасць архітэктуры. Такое выхаванне павінна пачынацца са школьнай парты. Міністэрствам культуры, вышэйшай адукацыі, Дзяржбуду БССР і творчым саюзам варта было б разам падумаць над рэкамендацыямі для правядзення пазакласнай і вучэбнай работы нашых школ. Трэба выдаць у бліжэйшы час серыю брашур у дапамогу выкладчыкам літаратуры і гісторыі, дзе папулярызавалася б гісторыя архітэктуры. Неабходна пашырыць навучальную праграму і рэгулярна знаёміць школьнікаў з гісторыяй архітэктуры.

У дакладзе быў ахарактарызаваны стан навукова-даследчай работы ў рэспубліцы, крытыкавалася дзейнасць Інстытута будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР, які сёння не ўплывае на вырашэнне праблемных пытанняў.

Асаблівую вастрыню і актуальнасць у рэспубліцы набываюць пытанні падрыхтоўкі архітэктараў. У гэтай важнай справе за апошні час дасягнуты некаторыя поспехі. Значна палепшылася падрыхтоўка архітэктараў у Беларускім політэхнічным інстытуце, аб чым сведчаць паспяховыя вынікі агляду лепшых студэнцкіх работ, які штогод праводзіцца ў Маскве. Праекты зроблены студэнтамі на добрым узроўні, па рэальных праграмах. Сёлета больш студэнтаў будзе прынята на першы курс архітэктурнага аддзялення політэхнічнага інстытута. Адкрыўся новы будаўнічы інстытут у Брэсце, дзе запланавана весці падрыхтоўку архітэктараў. Рыхтуе спецыялістаў і Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут.

Аднак тэмпы будаўніцтва растуць, і з кожным годам патрабуецца ўсё больш архітэктараў. Праектныя арганізацыі ўжо не могуць выканаць бясконцыя заказы, якія ідуць з будоўляў. У праектных арганізацыях ідзе няспынны штурм «тэрмінаў» і валу. Выйсце з гэтага становішча адно — патрэбны спецыялісты, іх адсутнасць немагчыма замяніць ніякімі арганізацыйнымі перабудовамі.

Характарызуючы арганізацыйную работу Саюза архітэктараў, дакладчык сказаў:

— Мы імкнуліся наблізіць нашу творчасць да практыкі праектавання і будаўніцтва, аналізавалі работу навуковых і праектных арганізацый, абмяркоўвалі архітэктурныя праблемы, наладжвалі выстаўкі, прапагандавалі архітэктуру на старонках перыядычнага друку і г. д.

Добра арганізавалі творчую работу Гомельскае аддзяленне (старшыня бюро Н. Калінічэнка) і аддзяленне «Белпрампраекта» (старшыня бюро Э. Бацян).

Праўленне саюза было актыўна звязана з мясцовымі аддзяленнямі Мінска, Гомеля, Брэста. Праўда, мясцовыя аддзяленні праяўляюць слабую ініцыятыву. Кола пытанняў, якія яны разглядаюць, вельмі вузкае. Саюз архітэктараў БССР пачаў абмяркоўваць творчасць асобных праектных арганізацый. Праўленне імкнулася актывізаваць прапагандысцкую работу сярод насельніцтва. Вясною гэтага года пры Мінскім Доме архітэктара арганізаваны кансультацыі для насельніцтва па пытаннях добраўпарадкавання і азелянення жылых тэрыторый. Аднак, нягледзячы на шырокую рэкламу ў друку, па радыё і тэлебачанні, да нас за цэлы месяц... не прыйшоў ніводзін чалавек.

Арганізавалі мы вячэрні універсітэт «Архітэктура» для вучняў старэйшых класаў.

З мэтай папулярызацыі беларускай архітэктуры вядзём вялікую работу ў нашым перыядычным друку, па радыё і тэлебачанні. Рад пытанняў, узнятых у газетах, меў водгук, і прапановы архітэктараў здзяйсняліся. Але неабходна адзначыць, што ў газетах, прызначаных для самага шырокага кола чытачоў, цяжка шырока і на высокім прафесіянальным узроўні весці сур'ёзную размову аб вялікіх і важных пытаннях, якія стаяць цяпер перад беларускай архітэктурай. Мы спадзяёмся, што хутка беларускія архітэктары будуць мець свой друкаваны орган.

Вялікая і плённая работа вядзецца нашым саюзам па падрыхтоўцы да святкавання 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

Увекавечваюцца гераічныя подзвігі савецкіх людзей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, рыхтуецца перасоўная выстаўка «Архітэктура Беларусі за 50 год». Аб'яўлены конкурс на мемарыяльны парк-помнік у Мінску па ўвекавечанню памяці воінаў, партызан і іншых грамадзян, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну 1941—1945 гадоў, будзе аб'яўлены конкурс на складанне праекта манумента. У гонар 50-годдзя Савецкай улады пачынае праводзіцца цыкл лекцый на прадпрыемствах і ва ўстановах на тэму «Архітэктура Беларусі за 50 год». Саюз архітэктараў прымае ўдзел у абмеркаванні праектаў знешняга афармлення гарадоў рэспублікі да 50-годдзя Савецкай улады.

Крытычна ацэньваючы выкананне наказу папярэдняга VIII з'езда архітэктараў БССР, неабходна адзначыць, што мы недастаткова аддалі ўвагі пытанням горадабудаўніцтва, рэгуляванню росту гарадоў і тыпавога праектавання. Мы не дамагліся таго, каб усе важнейшыя праекты своечасова абмяркоўваліся архітэктурнай грамадскасцю да іх зацвярджэння ў вышэйшых інстанцыях.

Нельга не прызнаць, што ў нас недастаткова разгорнута крытыка і самакрытыка пры творчым абмеркаванні праектаў.

Саюз павінен пастаянна шукаць і знаходзіць новыя формы і метады работы.

— У нашай архітэктуры, якая перажывае працэс станаўлення і далейшага свайго развіцця, — заключае дакладчык, — шмат праблем. І яны, бясспрэчна, будуць паспяхова вырашаны. Архітэктары Беларусі стаяць на пярэднім краі камуністычнага будаўніцтва. Рашэннямі XXIII з'езда КПСС на нас ускладзены вялікія і адказныя задачы па стварэнню сучасных гарадоў і вёсак, новых прамысловых прадпрыемстваў, фарміраванню эстэтычных густаў савецкіх людзей. Заўсёды быць на вышыні гэтых патрабаванняў — абавязак кожнага праекціроўшчыка, кожнага архітэктара.

Эскіз помніка ахвярам фашызму, які будзе ўстаноўлены ў раённым цэнтры Докшыцах. Скульптар Ул. Папсуеў.

АГІТБРЫГАДА Ў ДАРОЗЕ

Члены агітбрыгады Рэчыцкага раённага Дома культуры — частыя госці ў працаўнікоў калгасаў і саўгасаў раёна. Сёлета яны паказалі ўжо некалькі дзесяткаў канцэртаў.

Нядаўна агітбрыгада выступіла перад хлебаробамі саўгаса «Падалессе», жыхарамі вёсак Валадарск, Унорыца, Азершчына, меліяратарамі ўчастка № 1 Рэчыцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення.

Цёпла сустрэлі меліяратары песні савецкіх кампазітараў у выкананні салістаў Эдуарда Андрэенкі, Яфіма Шкопы і Сямёна Свідлера. Вялікі поспех выпаў на долю вакальнай групы ў складзе Тацяны Суворавай, Валянціны Наўгародскай, Любы Барсук, Людмілы Пішчэлкі і Вольгі Перадырэй. Парадавалі гледачоў работнікі Дома культуры Мікалай Кударэнка і Арнольд Кавальчук, якія выканалі сатырычныя куплеты на мясцовыя тэмы.

Цяпер удзельнікі агітбрыгады рыхтуюць канцэрты для хлебаробаў Лоеўскай зоны і меліяратараў аддаленых участкаў.

А. ЛІХАЧ.

РАСТОЎСКІ ТЭАТР Ў ГОМЕЛІ

Пасля выступленняў у Мінску спектаклем «Цыган» (інсцэніроўка вядомай аповесці А. Калініна) пачаў свае гастролі Растоўскі-на-Доне дзяржаўны драматычны тэатр імя М. Горкага ў Гомелі.

У час гастроляў адбудуцца сустрэчы артыстаў з гледачамі непасрэдна на прадпрыемствах, будоўлях, у саўгасах, калгасах. Працоўныя Гомеля праяўляюць вялікую цікавасць да спектакляў гасцей.

В. СЯМЕНАЎ.

З Растова — у Сочы

Звыш пяцідзесяці тысяч гледачоў пабывала на спектаклях Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета ў Растове-на-Доне. Цяпер трупа тэатра пераехала на гастролі ў Сочы. Свае выступленні тут беларускія артысты пачалі 2 ліпеня спектаклем Дж. Вердзі «Аіда».

Тэатр прабудзе на гастролях у Сочы ўвесь гэты месяц.

НАРОДЫ—СЯБРЫ І ПАПЛЕЧНІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

— Мы, савецкія людзі, — гаворыць у заключэнне дакладчык, — захапляемся велізарнымі дасягненнямі таленавітага, мужнага і працавітага мангольскага народа. І ў гэты ўрачысты дзень шчыра яшчэ раз жадаем нашым мангольскім братам новых поспехаў у развіцці сацыялістычнай эканомікі і культуры.

Са словамі шчырага прывітання на вечары выступілі рабочая абутковага вытворчага аб'яднання «Прамень» Г. А. Бараноўская, пісьменнік М. І. Калачынскі, міністр культуры БССР М. А. Мінковіч.

Па-брацку цёпла сустрэлі ўдзельнікі ўрачыстага вечара выступленне члена ЦК МНРП, міністра культуры МНР С. Сосарбарама. Ён падрабязна падзякаваў прысутным за гасцінны прыём, падрабязна расказаў аб рашэннях XV з'езда МНРП, які прыняў новую праграму партыі, зацвердзіў дырэктывы па чацвёртаму пяцігадоваму плану.

Тав. Сосарбарам адзначыў, што ўсе свае поспехі мангольскі народ звязвае з брацкай дапамогай і падтрымкай народаў Савецкага Саюза, у тым ліку і беларускага народа.

Пад бурныя апладысменты прысутных прамоўца ўручыў прэзідыуму схода вымпел Таварыства мангола-савецкай дружбы.

САМАБЫТНАЕ МАСТАЦТВА

Важнай падзеяй Дзён мангольскай культуры ў Беларусі з'явілася адкрыццё 6 ліпеня ў Мінскім Доме мастацтваў выстаўкі народнай творчасці МНР. Тут сабраліся майстры выяўленчага мастацтва, дзеячы культуры, прадстаўнікі інтэлігенцыі сталіцы рэспублікі, навучэнцкая моладзь, мангольскія госці.

З цёплымі словамі прывітання да гасцей звярнуўся старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР Ул. І. Стальмашонак.

— Сёння, — гаворыць ён, — мы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з яркім і самабытным мастацтвам мангольскага народа. Мастацтва — гэта душа і думы народныя. І, мяркуючы па прадстаўленых тут экспанатах, можна з поўнай падставай сказаць, што таленавіты той народ, у якім расцвітае такое мастацтва.

З прывітаннем да прадстаўнікоў мангольскага народа звярнуўся народны мастак БССР А. П. Марыкс.

Са словам у адказ выступіў член мангольскай дэлегацыі Базарын Дашцэрэн.

Пачынаецца агляд экспазіцыі. Гледачы захапляюцца мангольскім народным арнаментам. Ён прадстаўлен на выстаўцы разнастайнымі ўзорамі роспісу, аплікацыі, чаканкі па металу.

Найбольш старалаўнім відам народнага мастацтва Манголіі з'яўляецца вышыўка. Цудоўныя па прыгажосці ўзоры яе прадстаўлены на шматлікіх прадметах адзення і быту, фатаграфіях. Сярод іх — старадаўнія, вышытыя шоўкам малітоўнікі, нацыянальныя касцюмы і сучасныя карціны.

Высокага майстэрства дасягнулі майстры чаканкі па металу. Тут прыцягваюць увагу ўзоры зброі, посуду, а таксама рэпрадукцыі прадметаў хатняга ўжытку.

Папулярная ў Манголіі разьба па слановай косці і дрэву.

На выстаўцы прадстаўлены таксама ўзоры дывановага ткацтва, мастацкай апрацоўкі скуры, творы выяўленчага мастацтва.

У АЎТАМАБІЛЕБУДАЎНІКОЎ І ТРАКТАРАЗАВОДЦАЎ

6 ліпеня Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Мангольскай Народнай Рэспублікі ў Савецкім Саюзе Н. Луўсанчултэм, які знаходзіцца ў Мінску, наведаў Беларускі аўтамабільны завод у горадзе Жодзіна, што выпускае самыя магутныя ў Еўропе машыны-веліканы.

Разам з тав. Луўсанчултэмам на заводзе быў міністр замежных спраў БССР А. Е. Гурыновіч.

Члены дэлегацыі дзеячоў мангольскай культуры — пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Д. Намдаг, артысты Г. Хайдаў і Д. Тунгалаг — у той жа дзень наведалі Мінскі трактарны завод. Рабочыя цёпла сустрэлі пасланцоў брацкага мангольскага народа. Госці агледзелі прадпрыемства. Яны наглядалі зборку трактараў «Беларусь» на галоўным канвееры. Машыны гэтай маркі добра вядомы ў Манголіі. Мінскі трактарны завод з'яўляецца адным з 30 беларускіх прадпрыемстваў, якія выконваюць заказы брацкай краіны.

Увечары ў Палацы культуры завода адбыўся маладзёжны вечар Заводскага раёна беларускай сталіцы, прысвечаны савецка-мангольскай дружбе.

Юнакі і дзяўчаты з энтузіязмам, як родных братоў, сустрэлі прыбыўшых да іх у госці мангольскіх сяброў.

Калектыў мастацкай самадзейнасці трактаразаводцаў — народны ансамбль танца «Лявоніха»,—даў вялікі канцэрт. Сваё песеннае мастацтва прадэманстраваў народны хор Палаца культуры Мінскага будаўнічага трэста № 5.

Гарачымі апладысментамі ўзнагародзілі ўдзельнікі вечара выступленні мангольскіх артыстаў.

СУСТРАКАЮЦЬ БРЭСТАЎЧАНЕ

Вялікую цікавасць да жыцця, культуры і мастацтва брацкага мангольскага народа праяўляюць працоўныя Брэстчыны. Ажыўлена ў гэтыя дні ў абласным Доме палітасветы, дзе адкрыта выстаўка, прысвечаная дасягненням МНР, яе культуры і мастацтву. Такія ж выстаўкі разгорнуты на Брэсцкім дывановым камбінаце, у клубе калгаса «Аснежыцкі» Пінскага раёна і шэрагу іншых месц. Ва ўсіх кніжных магазінах, чытальных залах гарадскіх і сельскіх бібліятэк афармлены выстаўкі літаратуры МНР.

У кінатэатрах Брэста і вобласці пачаўся фестываль мангольскіх фільмаў. Тысячы людзей паглядзелі ўжо фільмы «Яго завуць Сухэ-Батар», «Смак свежага ветру», «Залатая юрта» і іншыя.

Пагранічны Брэст наведала група дзеячоў мангольскай культуры на чале з членам ЦК МНРП, міністрам культуры МНР С. Сосарбарамам. Кветкамі, сяброўскімі поціскамі рук сустрэлі прадстаўнікоў мангольскага народа працоўныя горада.

Усюды выступленні пасланцоў братняй Манголіі ператвараюцца ў яркую дэманстрацыю дружбы мангольскага і беларускага народаў.

Па матэрыялах БЕЛТА.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

8 ліпеня

Першая праграма. 17.05 — праграма перадач. 17.10 — для дзяцей. «Умелыя рукі». Кінафільм. 17.40 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — канцэрт па заяўках рыбакоў. 18.30 — першынство СССР па футболу. ЦСКА — «Дынама» (Масква) (М). 20.15 — эстафета навін (М). 21.20 — М. Лясkоў. «Марнатравец». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. 2-я серыя. Перадача з Ленінграда. 22.35 — для выпускніков школ. «У добры час!». Прэс-канферэнцыя з прадстаўнікамі міністэрстваў, навучальных устаноў, буйнейшых прадпрыемстваў. 23.35 — дзённік чэмпіянату свету па фехтаванню (М).

Другая праграма. 11.00 — панарама Радзімы (М). 11.30 — «Гутаркі ля раяля». Э. Грыг. Саната для віяланчэлі і фартэпіяна (М). 12.15 — «Вяртанне ў Чалякен». Дакументальны фільм (М). 17.00 — для школьнікаў. «Аўтамабіль пабудавалі самі». Перадача з Рыгі. 17.30 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.30 — наш кінаглобус. «Расказы пра Танганьіку». Дакументальны фільм. 19.20 — «Уваскрэсенне». Мастацкі фільм. 2-я серыя. 21.05 — па роднай краіне. «На запаветных сцежках». «Сыр-Дар'я». Кінанарысы. 21.35 — праграма мультыплікацыйных фільмаў для дарослых. 22.35 — у эфіры — «Маладосць». «Сучаснасць і я». Перадача другая (М).

9 ліпеня

Першая праграма. 13.40 — для школьнікаў. «Піянерскае лета» (М). 14.30 — для малышоў. «Царэўна-жаба». Спектакль Петразаводскага тэатра лялек (М). 15.30 — другое прызнанне. «Знаёмцеся — Спартак Каралёў». Расказ пра самадзейнага кампазітара. 16.20 — тэлевізійныя навіны. 16.50 — Дні мангольскай культуры ў БССР. «Ці ведаеце вы Мангольскую Народную Рэспубліку?» Віктарына. 17.20 — клуб кінападарожнікаў (М). 18.20 — тэлевізійнае акно сатыры (М). 18.35 — «Чалавек, што смяецца». Прэм'ера тэлевізійнага дакументальнага фільма. Вытворчасць ГДР (М). 19.30 — тэлевізійныя навіны (М). 20.00 — «На агеньчык». Перадача з Сочы. 21.20 — дзённік чэмпіянату свету па фехтаванню (М). 21.30 — «Музычны фестываль у Фертэдзе». Перадача з Венгрыі. 22.10 — «Гангстэры і філантропы». Мастацкі фільм.

Другая праграма. 15.30 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 16.00 — «Бакінскі Крэмль». Кінанарыс (М). 16.30 — тэлевізійныя навіны (М). 16.50 — народны музей «За ўладу Савецкую!» (М). 17.20 — чалавек і прырода. «Прагулка па Ледзяніке». «Лаўцы трэпангаў». «Па горнай Чусавой». Кінанарысы. 18.00 — «Жалудовы король». Тэлевізійны спектакль. 19.35 — «Алма-атінская вясна». Фільм-канцэрт. 21.00 — «Сёння прэм'ера». Дакументальны фільм. 22.10 — «Калі б не экзамены...» Мастацкі фільм (М).

10 ліпеня

Першая праграма. 10.30 — праграма перадач. 10.35 — «Там, дзе абуджаецца сонца». Тэленарыс пра рыбакоў Камчаткі (М). 10.50 — для малышоў. «Прыгоды Фэфі». Лялечны фільм (ГДР). 3-я серыя (М). 11.40 — у свеце мастацтваў. «Сафія Кіеўская». Перадача з Кіева. 13.00 — для дзяцей. «Рабі з намі; рабі, як мы». Перадача з ГДР. 14.00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Пра добалесць, пра подзвігі...» Перадача з Тбілісі. 14.30 — «Навіны дня». Кінахроніка (М). 14.40 — для школьнікаў. «Шлях да музыкі». Перадача з Ленінграда. 15.30 — музычны кіёск (М). 16.00 — тэлевізійныя навіны (М). 16.20 — усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. Перадача з Кішынёва. 17.00 — Р. Шарыдан. «Сапернікі». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Рыгі. 18.40 — «Тэлевізійны эканамічны веснік». Выпуск прысвячаецца Дню рыбака (М). 19.20 — «Рыбак рыбака бачыць здалёка». Эстрадны канцэрт (М). 20.00 — «Міфы XX стагоддзя». Міжнародная праграма. Перадача першая (М). 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — «Залатая юрта». Мастацкі фільм. 22.20 — у эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда. 23.20 — дзённік чэмпіянату свету па фехтаванню (М).

Другая праграма. 16.25 — для дзяцей. «Дзікі сабака Дзінга». Мастацкі фільм. 18.00 — Дні мангольскай культуры ў БССР. 19.00 — «Клічуць блакітныя шляхі». Дакументальны фільм. 19.35 — «Оперныя спевакі». Заслужаны артыст РСФСР Яўген Кібкала. 20.25 — «Вы з намі. Фрэдэрык Жаліо-Кюры». Дакументальны фільм. 21.00 — «Мяцеліца». Мастацкі фільм (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, адвыдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 02537